

«СПАМАШ»: НАША ЗАДАЧА – ЗРАБІЦЬ АРТЫСТА

ЧЫРВОНКА

ТВОРЧЫ КОНКУРС – НОВЫЯ НАЙЛЕПШЫЯ РАБОТЫ

ЧЫРВОНКА



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

29 ВЕРАСНЯ 2022 г. ЧАЦВЕР № 191 (29813)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір ГУСАКОЎ, старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук:**

*«Новым напрамкам беларуска-расійскага навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва становіцца сумесны праект у галіне пілатуемай касманаўтыкі. Прэзідэнтамі нашых дзяржаў Аляксандрам Рыгоравічам Лукашэнкам і Уладзіміравічам Уладзіміравічам Пуціным прынята рашэнне аб касмічным палёце грамадзяніна Беларусі на расійскі сегмент Міжнароднай касмічнай станцыі восенню 2023 года. Палёт беларускага касманаўта будзе знакавым для краіны. Гэта дазволіць узняць прэстыж Беларусі ў сусветнай супольнасці як касмічнай дзяржавы. Спадзяёмся, што гэта стане добрым пачаткам для цеснага ўзаемадзеяння шэрагу беларускіх арганізацый з дзяржкарпарацыяй «Раскосмас» на працяглую перспектыву».*

# ЗАЛАТЫ ЎРАДЖАЙ НА РАДЗІМЕ ПАЭТА





Фота БелТА.

**Адкрытае акцыянернае таварыства «Радзіма Якуба Коласа» працягвае гэтымі днямі ўборку кукурузы. Усяго трэба будзе ўбраць з плошчы больш як 890 гектараў. Частка ўраджаю пойдзе на зерне, другую частку аграрыі нарыхтуюць на сілас. Завяршыць уборку ў гаспадарцы «Радзіма Якуба Коласа» плануюць у найбліжэйшыя тыдні.**

***На здымку:*** **начальнік вытворчага ўчастка Раман ЦВІРКО.**

## КОРАТКА

- **Вобраз Беларусі ў традыцыйным кітайскім жывапісе пакажуць на выставе ў Мінску.**
- Планавую дату ўключэння ацяплення можна даведацца на партале 115.бел.
- **Правілы бяспекі, расследавання і ўліку няшчасных выпадкаў з навучэнцамі зацверджаны ў Беларусі.**
- Саўмін да 1 сакавіка ўнясе прапановы па пытанненні драўніны для будаўніцтва жылля.

ISSN 1990 — 763X

Прыклад для пераймання

## ЦУДОЎНЫ САД,

### або Як вяскоўцы спрабуюць выратаваць ад выкарчоўвання 1200 яблынь



**Стары яблыневы сад плошчай 16 гектараў, які месціцца ў вёсцы Вялікае Запруддзе, што на Валожыншчыне, яшчэ зусім нядаўна быў пад пагрозай знікнення. Каб яго захаваць, тамтэйшыя жыхары аб'ядналіся і стварылі спажывецкі сельскагаспадарчы кааператыў «Цудоўны Сад». Пакуль мясцовыя ўлады далі неабыякавым вяскоўцам выпрабавальны тэрмін — год, каб праверыць сур'ёзнасць іх намераў. Калі яны справяцца, дакажуць, што здольныя клапаціцца пра сад, ім абяцаюць перадаць яго ў арэнду на 99 гадоў для садаводства і ажыццяўлення крэатыўных ідэй.**

СТАР. 12

На парадку дня

## ЯДЗЕРНАЯ БЯСПЕКА І РАДЫЯЦЫЙНЫ КАНТРОЛЬ

### Аб чым расказалі эксперты

**Што адбываецца на аб'ектах выкарыстання атамнай энергіі? Што робіцца з крыніцамі іанізуючых выпраменьванняў? Што дзеецца на чарнобыльскіх тэрыторыях? Адказы на ўсе гэтыя і іншыя пытанні Дзяржатамнагляд штогод у адкрытым доступе змяшчае на сваім сайце ў тэматычным аглядзе, прысвечаным стану ядзернай і радыяцыйнай бяспекі ў Беларусі. Сёлета ўпершыню падрыхтавана не толькі інтэрнэт-версія агляду (71 старонка), але і запланаваны невялікі тыраж да друку. Пра што распавядае свежы вераснёўскі дакумент, расказалі эксперты.**



Фота Ірыны СІДАРОК.

СТАР. 3

# НА СУСТРЭЧУ З СЕНАТАРАМ

## 5 кастрычніка члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу правядуць адзіны дзень прыёму грамадзян у Мінскай вобласці

**Парламентарыі наведаюць усе раёны Міншчыны, сустрэнуцца з жыхарамі, выслухаюць іх просьбы, прапановы і скаргі, па магчымасці пасадзейнічаюць у вырашэнні хвалюючых пытанняў.**

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Іванаўна КАЧАНАВА** прыме грамадзян з 11.00 у Салігорскім райвыканкаме (г. Салігорск, вул. Казлова, 35, тэлефоны для запісу: 8-017-328-53-24, 8-017-328-58-11).

Людзей чакаюць у выканкамах:

**— старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей Міхайлавіч СІВЕЦ** — з 11.00 у Старадарожскім райвыканкаме (г. Старыя Дарогі, вул. Пралетарская, 38; тэлефоны для запісу: 8-017-327-22-26, 8-017-925-68-31);

**— старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна Аркадзеўна РУНЕЦ** — з 11.00 у Слуцкім райвыканкаме (г. Слуцк, вул. Леніна, 189; тэлефоны для запісу: 8-017-327-25-27, 8-017-957-53-02, 8-017-957-50-05);

**— старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар Андрэевіч ЛІСКОВІЧ** — з 11.00 у Вілейскім райвыканкаме (г. Вілейка, вул. Партызанская, 40; тэлефоны для запісу: 8-017-327-26-71, 8-017-715-37-22);

**— старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіл Іванавіч РУСЫ** — з 11.00 у Любанскім райвыканкаме (г. Любань, вул. Першамайская, 24А; тэлефоны для запісу: 8-017-327-36-73, 8-017-945-52-38);

**— намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Дзмітрый Юр'евіч БАСКАЎ** — з 10.00 да 12.00 у Лагойскім (г. Лагойск, вул. Савецкая, 15; тэлефоны для запісу: 8-017-336-12-42, 8-017-745-25-82) і з 14.00 да 16.00 у Смалявіцкім (г. Смалявічы, вул. Савецкая, 125; тэлефоны для запісу: 8-017-336-12-42, 8-017-762-58-91) райвыканкамах;

**— намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Аляксандр Аляксандравіч БАЧЫЛА** — з 11.00 да 13.00 у Бярэзінскім (г. Беразіно, вул. Кастрычніцкая, 18; тэлефоны для запісу: 8-017-204-77-33, 8-017-155-50-45) і з 14.00 да 16.00 у Чэрвеньскім (г. Чэрвень, пл. Свабоды, 1; тэлефоны для запісу: 8-017-204-77-33, 8-017-142-23-24) райвыканкамах;

**— намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Валерый Уладзіміравіч ГАЙДУКЕВІЧ** — з 10.00 да 12.00 у Нясвіжскім (г. Нясвіж, вул. Савецкая, 1; тэлефоны для запісу: 8-029-704-31-80, 8-017-705-92-51) і з 14.00 да 16.00 на Уздзенскім (г. Узда, вул. Савецкая, 22; тэлефоны для запісу: 8-029-704-31-80, 8-017-185-14-34) райвыканкамах;

**— намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Марына Аляксандраўна ІЛЬІНА** — з 10.00 да 12.00 у Валожынскім (г. Валожын, пл. Свабоды, 2; тэлефоны для запісу: 8-029-641-93-96, 8-017-726-90-88) і з 14.00 да 16.00 у Маладзечанскім (г. Маладзечна, вул. Віленская, 6; тэлефоны для запісу: 8-029-641-93-96, 8-017-673-02-67) райвыканкамах;

**— намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Уладзімір Міхайлавіч ЛУК'ЯНАЎ** — з 10.00 да 12.00 у Стаўбцоўскім (г. Стоўбцы, вул. Ленінская, 45; тэлефоны для запісу: 8-017-172-18-18, 8-017-177-75-20) і з 13.00 да 15.00 у Дзяржынскім (г. Дзяржынск, пл. Дзяржынскага, 1; тэлефоны для запісу: 8-017-162-18-18, 8-017-165-33-02) райвыканкамах;

**— член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Наталля Віктараўна ЯКУБІЦКАЯ** — з 11.00 у Мінскім райвыканкаме (г. Мінск, вул. Альшэўскага, 8; тэлефоны для запісу: 8-029-849-33-88, 8-017-270-33-74);

**— член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Алена Алегаўна ЗЯБЛІКАВА** — з 9.00 да 11.00 у Барысаўскім (г. Барысаў, вул. Чапаева, 6; тэлефоны для запісу: 8-0177-75-13-13, 8-0177-73-23-66) і з 13.00 да 15.00 у Крупскім (г. Крупкі, вул. Савецкая, 8; тэлефоны для запісу: 8-017-775-13-13, 8-017-962-77-47) райвыканкамах;

**— член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Каліна Віктараўна КАПУЦКАЯ** — з 11.00 у Мядзельскім райвыканкаме (г. Мядзел, пл. Леніна, 1; тэлефоны для запісу: 8-017-655-23-13, 8-017-974-10-09);

**— член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Іван Іванавіч ГАЛАВАТЫ** — з 10.00 да 12.00 у Клецкім (г. Клецк, пл. Маякоўскага, 10; тэлефоны для запісу: 8-017-429-87-48, 8-029-557-96-04, 8-017-935-06-57) і з 13.00 да 15.00 у Капыльскім (г. Капыль, пл. Леніна, 6; тэлефоны для запісу: 8-017-429-87-48, 8-029-557-96-04, 8-017-195-55-66) райвыканкамах;

**— член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Алег Віктаравіч ДЗЯЧЭНКА** — з 11.00 у Пухавіцкім райвыканкаме (г. Мар'іна Горка, вул. Ленінская, 47; тэлефоны для запісу: 8-017-378-78-28, 8-017-132-04-24).

**Папярэдні запіс ажыццяўляецца 29 і 30 верасня з 9.00 да 13.00 і з 14.00 да 16.00.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Завяршыліся рэферэндумы ў ДНР, ЛНР, Херсонскай і Запарожскай абласцях



Падлічаны 100 працэнтаў бюлетэняў, паведаміла ТАСС. Згодна з вынікамі галасавання, за ўваходжанне ў склад Расіі аддалі свае галасы 99,23 % жыхароў ДНР, 98,42 % жыхароў ЛНР, 93,11 % жыхароў Запарожскай вобласці і 87,05 % жыхароў Херсонскай вобласці. Вядомыя і вынікі галасавання, якое праводзіцца для жыхароў гэтых чатырох рэгіёнаў на тэрыторыі Расіі. Уступленне ДНР у склад Расіі падтрымалі 98,69 %, за далучэнне ЛНР да Расіі выказалася 97,93 %, за ўваходжанне Запарожскай вобласці ў Расійскую Федэрацыю аддалі галасы 97,81 % выбаршчыкаў, далучэнне Херсонскай вобласці да РФ падтрымалі 96,75 %. У Цэнтральнай выбарчай камісіі ЛНР паведамілі, што яўка на рэферэндуме з улікам участкаў у РФ склала 94,15 %, у Запарожскай вобласці — 85 %, у ДНР — 97,51 %, у Херсонскай вобласці — 78,86 %. Рэферэндумы праходзілі з 23 да 27 верасня.

## Амерыканцы з цяжкасцю аплачваюць «камуналку» з-за росту цэн на энерганосьбіты



Мільёны амерыканцаў спрабуюць справіцца з ростам цэн на электраэнергію і прыродны газ на фоне росту інфляцыі, паведаміў тэлеканал CBS News. Паводле даных Bank of America, каля 20 працэнтаў хатніх гаспадарак у ЗША прапусціла або пратэрмінавала аплату рахункаў за камунальныя паслугі ў мінулым месяцы. Рахункі за «камуналку» ў жніўні ўзраслі прыкладна на 16 працэнтаў у параўнанні з тым жа месяцам мінулага года. Пры гэтым больш за ўсё пацярпелі жыхары Даласа і Х'юстана, дзе гэтым летам назіралася адно з самых адчувальных у краіне павышэнняў рахункаў за камунальныя паслугі (23 працэнты ў гадавым вылічэнні). Адной з галоўных прычын гэтага сталі высокія цэны на энерганосьбіты. Чакаецца, што рост тарыфаў працягнецца будучай зімой. Пры гэтым, многія амерыканскія энергетычныя кампаніі ўжо аб'явілі аб сваім плане іх павышэння. Мяркуецца, што сярэднестатыстычная двораг аспадарка гэтай зімой будзе плаціць за ацяпленне прыкладна на 17 працэнтаў больш, чым летась. Паводле прагнозаў, узрастуць і рахункі за электраэнергію.

## Банкі Вялікабрытаніі прыпынілі выдачу іпатэчных крэдытаў пасля рэзкага падзення нацвалюты



Найбуйнейшыя банкі Вялікабрытаніі часова спынілі выдачу іпатэчных крэдытаў новым кліентам з-за значнага падзення курса нацыянальнай валюты. Пра гэта паведаміла «Бі-бі-сі». У прыватнасці, банк Halifax абвясціў, што прыпыняе выдачу крэдытаў з фіксаванай стаўкай. У Virgin Money і Skipton Building Society таксама ставяць на паўзу іпатэчныя здзелкі з новымі кліентамі. У аб'яўленні банкаў гаворыцца, што яны павысяць працэнтныя стаўкі для стрымлівання інфляцыі пасля таго, як фунт упаў да рэкордна нізкага ўзроўню. Раней міністр фінансаў Вялікабрытаніі Квазі Квартэнг абвясціў аб зніжэнні максімальнай стаўкі падаходнага падатку з 45 да 40 працэнтаў. Аднак гэта пацягнула за сабой рост інфляцыі, якая цяпер складае 9,9 працэнта — максімальны ўзровень за апошнія 40 гадоў.

По сутнасці

# Шанец Адстаяць Суверэнітэт



Гібелі папярэднічае гордасць, а падзенню — фанабэрыстасць, сцвярджае біблейская аксіёма. Нарэшце яна пачынае дзейнічаць і ў геапалітыцы. Для краін свету ЗША пачынаюць губляць свой шарм — цягнецца доўгі шлейф дрэнных спраў. Нарэшце сябе праяўляюць дзяржавы вялікіх памераў, з вялікай колькасцю насельніцтва, з багаццямі ў нетрах, а галоўнае — з багаццямі, якія нельга падлічыць на фондавых біржах ці вымераць у тонах або фунтах. Я аб культурным пласце, аб духоўна-мастацкай спадчыне, аб самабытным цывілізацыйным «бэкграўндзе». Нарэшце гэтыя дзяржавы пачынаюць, не саромеючыся, не азіраючыся на некага, гучна прапаноўваць свету сваю мадэль развіцця. Маю на ўвазе краіны Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва.

Давайце зазірнем глыбей, чым звычайны пост у «Тэлеграме» альбо рэклама заморскага жыцця. Пасля шматлікіх тэхнічных вынаходніцтваў людзі вырашылі, што войны засталіся ў кніжках па гісторыі, і стварылі Лігу нацый. Нават яскравая ілюстрацыя таго часу была: анёл з дудкай сярод ваўкоў. Уміласцівіць драпежнікаў не атрымалася. І нацыі, якія так натхнёна прапагандавалі «оды да радасці», з лёгкасцю пачалі знішчаць іншыя народы і дзяржавы.

Да прытомнасці аматараў «веймарскага класіцызму» прывялі тыя, хто і без знаёмства з Шылерам маглі «людзьмі звацца». У выніку нашай Перамогі з'явілася Арганізацыя Аб'яданых Нацый. Сярод заснавальнікаў і беларусы, якія страцілі кожнага трэцяга, і амерыканцы, што спачатку гандлявалі на два бакі, а пасля адкрылі другі фронт. Дарэчы, толькі пасля таго, як савецкія войскі вызвалілі палову Беларусі. ААН — рэферы сусветнага маштабу — прапісалі адразу ў некалькіх сталіцах свету. Але ж галоўную штаб-кватэру адкрылі ў ЗША. У краіне, створанай людзьмі, якія лепш за іншых валодалі «кольтам». Ад зачысткі сваіх тэрыторый ад індзейцаў яны паступова перайшлі да зачыстак міжнароднага маштабу. Рабства было адменена на плантацыях Штатаў, але філасофія ўладароў экстрапалявалася на ўсю планету. Не паспелі першыя цаглінкі Берлінскай сцяны разысціся на сувеніры, а з маўклівага дазволу Савета бяспекі ААН пад крыламі вашынгтонскіх ястрабаў аказаліся дзясяткі краін свету.

Уся геапалітыка пачала нагадваць «панянцці» вулічнай шпаны. Калі адзін задзіра трымае ў страху ўвесь двор. Некаторыя да яго далучаюцца, бо занадта падобныя на яго, а большасць — з-за боязі, каб не застацца сярод пакрыўджаных. Так і атрымалася пасля развалу Саюза. У «вогнішча» сусветнай «каляровай рэвалюцыі» траплялі незалежныя кіраўнікі багатых дзяржаў. У гэты няпросты час адсутнасці моцных цэнтраў сілы, атак заморскай дэмакратыі афіцыйны Мінск змог зберагчы сябе. Замест бамбёжак мастоў у Бялградзе, Беларусь прапаноўвала будаваць масты супрацоўніцтва ў Еўропе. Калі не ў ваенным, то хоць бы ў эканамічным плане. Але амерыканскаму гегемону замінала міралюбівая архітэктура еўрапейскай бяспекі. Намаганні ЕС нагадвалі звычайную дваровую карціну. Калі кампанія малых дзяцей будуе пясочныя гарадкі, а пасля прыходзіць падлетак-пераростак у бейсболцы з вядомым сцягам і ўсё знішчае. Пачынайце спачатку.

Нанава ўзводзіць будынак міжнародных адносін пачалі на ўсходняй глебе. Бліжэй да сонца — кажуць, так плады больш смачныя. Напэўна, ШАС павінна стаць прывабнай для многіх. Па-першае, гэта саюз аднаго некалькіх цывілізацый. Глыбінных. Напрыклад, для Кітая Вялікая сцяна — усяго толькі архітэктурная славутасць. Архаіка. А для краін заходніх блокаў сцяна на граніцы па-ранейшаму інструмент палітычнага ўздзеяння. Навошта было разбураць Берлінскую сцяну, каб будаваць сцяну непаразумення на граніцы Польшчы і Беларусі? Правільна, каб англасаксы здолелі пашырыць тэрыторыю свайго панавання. Вядома, у планах, бадай, была пагранічная сцяна паміж Оршай і Смаленскам. Але ж памыліліся. Не ўлічылі адну важную акалічнасць. Палітычную харызму кіраўніка Беларусі. Ён праявіў сябе і на гістарычным саміце ў Самаркандзе.

У Брусэлі не пачулі прапановы Мінска аб інтэграцыі інтэграцый ад Лісабона да Уладзівастока. Гэта ж уяўляеце, калі заходнія тэхналогіі аб'яднаць з сыравінай Усходу?! Еўразія — самы вялікі мацярык свету — стаў бы яшчэ і восьмым эканамічным цудам свету. Але ж нехта замінае. Я не думаю, што гэта робяць баўэры з Баварыі ці гандляры з-пад Варшавы.

Мабыць, хопіць азірацца на іншыя блокі і саюзы, давайце будаваць свой, самадастатковы. Далучацца і іншыя краіны. Такія вось парады даў беларускі Прэзідэнт. Спадабаліся і палітыкам, і журналістам. Заўважна было па рэакцыі ўдзельнікаў саміту ШАС, а таксама актыўнасці фатографаў і рэпарцёраў падчас выступлення Аляксандра Лукашэнкі. Журналісты «не прашчоўкалі» гістарычную заяву, галоўнае цяпер, каб і краіны-старажылы ШАС «не прашчоўкалі» зорны час гэтага інтэграцыйнага аб'яднання. Пад эмблемай ШАС — чвэрць сусветнай эканомікі, амаль палова насельніцтва Зямлі. Лічбы важныя, але ёсць і больш надзейныя апоры. Гэта ідэалогія самога працэсу аб'яднання. Калі калектыўны Захад прапануе глабалізацыю або больш радыкальны амерыканскі варыянт — вестэрнізацыю, то зносіны ў «шанхайскім духу» — гэта інтэграцыя. Розніца не толькі ў тэрмінах. Галоўная ідэя глабалізацыі — знішчыць межы суверэннасці, адметнасці, эканамічнай самадастатковасці. Нават межы дазволенага ў культурным кодзе, межы так званай гендарнасці. Інтэграцыя — гэта калі агульны вынік дапасобы ўсім удзельнікам працэсу. ШАС — своеасаблівы геапалітычны ліфт, які любую краіну ўздымае на высокі паверх міжнароднай пляцоўкі. Нездарма ж абрэвіятуру ШАС альтэрнатыўна пераклалі як «шанц адстаяць суверэнітэт».

Беларусь узмацняе супрацоўніцтва. Мы пераходзім на найвышэйшы паверх ШАС — у статус паўнаварстаснага ўдзельніка. Але ўвогуле не збіраемся сыходзіць і з трыбуны ААН. Мы сярод заснавальнікаў. Бо на якіх бы высокіх паверхах хмарачосаў ні засядалі амерыканскія палітыкі, наша сціплая вежа абарончага дойлідства нашмат старэйшая за гісторыю іх дзяржаўнасці.

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

# ЯДЗЕРНАЯ БЯСПЕКА І РАДЫЯЦЫЙНЫ КАНТРОЛЬ

## Добраахвотны абавязак

Дзяржатамнагляд разглядае названы дакумент як абавязак перад насельніцтвам і грамадскасцю краіны, якія маюць права валодаць такімі звесткамі і аналізаваць іх.

— У дакументах Міжнароднага агенцтва па атамнай энергіі (МАГАТЭ) ёсць палажэнні (і Беларусь іх цалкам падзяляе), што інфармацыйная дзейнасць рэгулюючага органа моцна ўплывае на забеспячэнне бяспекі. Яе ўздзеянне можна супаставіць нават з тэхнічнымі аспектамі ядзерных установак, — падкрэсліў **Алег СОБАЛЕЎ, кансультант Дзяржатамнагляда**. — Штогадовыя агляды, прысвечаныя стану ядзернай і радыяцыйнай бяспекі ў Беларусі, якія рыхтуюцца з 2014 года, — толькі маленькая частка інфармацыйнай работы. Дзяржатамнагляд адносна бяспекі мае цэлую інфармацыйна-камунікацыйную стратэгію. Дзякуючы рабоце, якую мы вядзём сумесна са сродкамі масавай інфармацыі, у грамадскай свядомасці ўкараняецца думка, што бяспека на АЭС — прыярытэт нумар адзін. Усе разумеюць ролю і функцыю рэгулюючага органа і іншых арганізацый, якія забяспечваюць ядзерную і радыяцыйную бяспеку. Нядаўна ў Палацe прадстаўнікоў быў прыняты ў другім чытанні праект закона аб рэгуляванні бяспекі пры выкарыстанні атамнай энергіі. Палажэнні дакумента падымаюць на належны ўзровень інфармацыйную дзейнасць у дадзенай сферы.

Заканадаўчая аснова, моцны рэгулюючы орган для рэгулявання і ліцэнзавання, навука, падрыхтоўка кадраў, аварыйная гатоўнасць і рэагаванне — усё гэта складовыя часткі інфраструктуры ядзернай і радыяцыйнай бяспекі, без якой работа ядзерных аб'ектаў немагчымая ў прынцыпе. Таму важна расказваць не толькі пра аб'екты, але і іх інфраструктуру, дадаў спецыяліст.

## Ядзерная інфраструктура

Агляд стану ядзернай і радыяцыйнай бяспекі ў краіне за 2021 год падрыхтаваны Дзяржатамнаглядам сумесна з Дэпартаментам па ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, Міністэрствам аховы здароўя, Мінпрыроды і Цэнтрам па ядзернай і радыяцыйнай бяспецы, расказала **Кацярына ШМЯЛЁВА, намеснік начальніка ўпраўлення па абыходжанні з радыеактыўнымі адходамі Дзяржатамнагляда.**

— Сёлетні агляд у пэўнай ступені ўнікальны. Ён складаецца з дзвюх частак, першая з якіх прысвечана якраз фарміраванню і развіццю інфраструктуры ядзернай і радыяцыйнай бяспекі, што адбывалася ў краіне на працягу 15 гадоў. Пры гэтым спецыялісты абапіраліся на рэкамендацыі МАГАТЭ. У першай частцы дакумента таксама гаворыцца пра дзейнасць рэгулюючага органа — Дзяржатамнагляда.

Яна нагадала пра паслядоўнае ўдасканаленне нацыянальнага заканадаўства, развіццё ядзернага права, удасканаленне падыходаў да нагляднай дзейнасці, выбудоўванне дзейсных сістэм ліцэнзавання і дазвольнай дзейнасці.

Навукова-тэхнічная падтрымка рэгулюючай дзейнасці ад 17 арганізацый, якія адказваюць у тым ліку і за падрыхтоўку кадраў для галіны, — яшчэ адзін элемент інфраструктуры. Таксама, як і сістэма забеспячэння аварыйнай гатоўнасці і рэагавання, забеспячэнне краінай міжнародных абавязацельстваў у сферы бяспекі. За гэты час сфарміраваўся і пул з сотні экспертаў, якія маюць права праводзіць экспертызу бяспекі ў галіне выкарыстання ядзернай энергіі. Падрабязнае апісанне ўсіх элементаў таксама прадстаўлена ў першай частцы агляду.

Хоць з моманту аварыі на ЧАЭС прайшло ўжо 36 гадоў, важнымі і актуальнымі застаюцца пытанні гарантавання радыяцыйнай бяспекі насельніцтва, якое пражывае на тэрыторыях, забруджаных радыенуклідамі. Цяпер гэта 25,5 тысячы км² — больш за 12 % агульнай плошчы Беларусі, дадала Кацярына Шмялёва:

— У аглядзе таксама прадстаўлена кароткая даведка аб функцыянаванні Палескага дзяржаўнага радыяцыйна-экалагічнага запаведніка. У першай частцы ёсць раздзел аб рабоце дзяржаўнага дазіметрычнага рэгістра. Прыведзены звесткі пра дозы апрамянення персаналу; дозы, атрыманыя пры правядзенні медыцынскіх даследаванняў; дозы, атрыманыя насельніцтвам на забруджаных тэрыторыях.

## Крыніцы выпраменьвання

У другой частцы агляду змешчана інфармацыя пра стан бяспекі на аб'ектах выкарыстання атамнай энергіі і ў арганізацыях, якія ў сваёй дзейнасці прымяняюць крыніцы іанізуючага выпраменьвання.

У Беларусі звыш 1700 арганізацый, якія эксплуатуюць больш за 24 тысячы крыніц іанізуючага выпраменьвання. 80 % з іх выкарыстоўваюцца ў медыцыне (у асноўным гэта рэнтгенаўскія дыягнастычныя апараты), расказала **Ірына ТКАЧОНАК, начальнік аддзела арганізацыі нагляду за радыяцыйнай бяспекай крыніц іанізуючага выпраменьвання Дзяржатамнагляда:**

— Такія крыніцы прымяняюцца таксама ў прамысловасці і навуцы. Гэта гама-ўстаноўкі, радыеізатопныя прылады. Усё часцей прымяняюцца яны і для нагляду. У метро, напрыклад, гэта рэнтгенаўскія ўстаноўкі для нагляду багажу і тавараў. На пунктах мытнага кантролю — вялікія інспекцыйна-наглядныя паскаральныя комплексы для нагляду транспартных сродкаў. Крыніцы іанізуючага выпраменьвання класіфікуюцца па пяці ступенях радыяцыйнай небяспекі. Сувымерна з імі праводзяцца і наглядныя меры. Аб'екты, якія праверяюцца, пры гэтым падзяляюцца на тры групы рызыкі: высокую (аб'екты гэтай групы правяраюцца раз на год ці два), сярэднюю (раз на тры ці пяць гадоў) і нізкую (раз на чатыры ці сем гадоў).

Штогод праводзіцца каля 150 планавых праверак, а таксама прафілактычныя і папераджальныя меры ў форме абследаванняў, нарад, размоў з прадстаўнікамі суб'ектаў, якія правяраюцца. На сайце Дзяржатамнагляда штоквартальна змяшчаецца інфармацыя з тыпавымі парушэннямі, выяўленымі падчас праверак (за тры, шэсць, дзевяць і дванаццаць месяцаў). А таксама чэк-лісты — кантрольныя спісы пытанняў са спасылкамі на нарматыўна-прававыя акты, з тлумачэннямі і магчымасцю рабіць паметкі, удакладніла спецыяліст:

— Дзяржатамнагляд вядзе адзіную дзяржаўную сістэму ўліку і кантролю крыніц іанізуючага выпраменьвання. Існуе працэдура пастаноўкі і зняцця з уліку крыніц у гэтай сістэме. Выдаюцца дазволы на ўвоз і вываз з Беларусі пэўных відаў такіх крыніц. Разглядаюцца дакументы аб прадаўжэнні тэрміну эксплуатацыі закрытых крыніц іанізуючага выпраменьвання, праекты вываду з эксплуатацыі найбольш небяспечных крыніц і аб'ектаў. У аглядзе ёсць падрабязная інфармацыя пра вынікі нагляду за радыяцыйнай бяспекай крыніц у 2021 годзе.

**Ірына СІДАРОК.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**

Продавец: Открытое акционерное общество «Оршанский комбинат строительных материалов», 211038, Витебская обл., Оршанский р-н, г. п. Копысь, ул. Октябрьская 80, тел.: +375 29 2953541, +375 216 576881.

Организатор аукциона: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: (0212) 24-63-12, (0212) 24-63-12, 8 (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by.

**Лот № 1.** Кап. строение с инв. № 240/С-33179 площадью 85,1 кв. м по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. п. Копысь, ул. Карла Маркса, 22, наименование – Жилой дом, назначение – здание одноквартирного жилого дома, составные части и принадлежности: одноэтажный жилой дом из силикатных блоков с холодной пристройкой, двумя террасами, сараем. Котел газовый ECO4S18F в комплекте с трубой и коленом (в отопительной системе дома). Имущество расположено на земельном участке с кадастровым номером 223655400001000143 площадью 0,16 га (право постоянного пользования) по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. п. Копысь, ул. Карла Маркса, 22, назначение – зем. участок для строительства и обслуживания жилого дома.

**Нач. цена: 30130,00 бел. руб. без НДС. Задаток: 3013,00 бел. руб.**

Шаг аукциона – 1506,50 бел. руб.

**Обременение:** договор найма служебного жилого помещения от 30.06.2014 на срок действия трудовых отношений. Нанимателю направлено предупреждение о расторжении договора найма 25.10.2022 и обязанности освободить жилое помещение всем гражданам, совместно с ним проживающим.

**Торги в форме открытого аукциона состоятся 31.10.2022 в 12.00.** по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. п. Копысь, ул. Октябрьская 80, в ОАО «Оршанский комбинат строительных материалов». Заявления для участия в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.30 по 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков, приема заявлений и прилагаемых документов на участие в аукционе: **с 30.09.2022 с 08.30 по 28.10.2022** до 17.30. Сумма задатка перечисляется Организатору на р/с № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Условия аукциона:** Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан: в течение 5 дней со дня проведения аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам документации, необходимой для его проведения, и расходы по проведению независимой оценки предмета аукциона, подписать договор купли-продажи в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона, оплатить предмет аукциона в течение 10 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи. Освобождение от оплаты НДС согласно п. 1.33 ст. 118 НК РБ. **Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.** Лицо, желающее участвовать в аукционе, обязано подать организатору аукциона в указанный срок заявление на участие в аукционе документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/с, указанный в извещении, с отметкой банка, представить: юр. лицом резидентом РБ – копии устава (учредительного договора – для коммерческой организации, действующей только на основании учредительного договора), имеющего штамп, свидетельствующий о проведении государственной регистрации, и свидетельства о гос. регистрации и их подлинники для заверения копий организатором аукциона, доверенность представителю юр. лица или документ, подтверждающий полномочия руководителя юр. лица; юр. лицом, иной организацией нерезидентом РБ – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до даты подачи заявления) или иное равнозначное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык, легализованная в установленном порядке доверенность представителю юр. лица, иной организации или другие легализованные в установленном порядке документы с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; индивид. предпринимателем – резидентом РБ – копия свидетельства о гос. регистрации и подлинник для заверения копии организатором аукциона; индивид. предпринимателем нерезидентом РБ – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; представителем гражданина РБ, индивид. предпринимателя – резидента РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного физ. лица, индивидуального предпринимателя – нерезидента РБ – легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов на участие в аукционе заявители и/или их представители предъявляют оригинал документа, удостоверяющего личность. Протокол о результатах аукциона подписывается в день проведения аукциона. В случае если аукцион признан несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, либо для участия в них явился только один участник, предмет аукциона продается при согласии этого участника по начальной цене, увеличенной на 5 %. Ознакомиться с предметом аукциона можно в рабочие дни по предварительному согласованию с Продавцом: Хоруженок Людмила Альбиновна +375292953541.

**ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ООО «Мётча Агро»**

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Автомобиль VAZ-21061 (рег. знак 6394 KA-5), 2001 г. в. – легковой седан | 529,20 | 52,92 | 26,46 |
| 2 | Автомобиль ГАЗ 33021 (рег. знак 9165 AE-5), 2004 г. в. – грузовой специальный фургон изотермический | 1944,00 | 194,40 | 97,20 |
| 3 | Автомобиль ZIL-MMZ-4502-АД (рег. знак AI 8942-5), 1982 г. в. – грузовой специальный самосвал | 1620,00 | 162,00 | 81,00 |
| 4 | Автоцистерна на шасси автомобиля ГАЗ 3307 (инв. № 264), 1991 г. в. | 4428,00 | 442,80 | 221,40 |
| 5 | Дробилка кормов молотковая пневматическая ДКМП-1,6 (инв. № 3801), 2011 г. в. | 907,20 | 90,72 | 45,36 |
| 6 | Зернометатель электроприводной ЗМЭ-60-01-80 (инв. № 1979), 2006 г. в. | 993,60 | 99,36 | 49,68 |
| 7 | Машина первичной очистки зерна МЗС-20(25) (инв. № 1291), 2009 г. в. | 5076,00 | 507,60 | 253,80 |
| 8 | Подборщик ПКК 1-0350000А (инв. № 3722), 2012 г. в. | 1404,00 | 140,40 | 70,20 |
| 9 | Полуприцеп ПСТ-3,5 (инв. № 3597), 2010 г. в. | 1047,60 | 104,76 | 52,38 |
| 10 | Прицеп MAZ 857100 (рег. знак А 7340 А-5), 2009 г. в. | 1728,00 | 172,80 | 86,40 |
| 11 | Протравливатель семян ПС-10АМ (инв. № 3474), 2005 г. в. | 3888,00 | 388,80 | 194,40 |
| 12 | Смеситель кормов вертикальный СКВ-4,01-ОЦ (инв. № 3803), 2011 г. в. | 3888,00 | 388,80 | 194,40 |
| 13 | Трактор «Беларус» 3022 ДЦ1 (зав. № 30202304), 2010 г. в. | 30672,00 | 3067,20 | 1533,60 |
| 14 | Трактор «Беларус» 3022 ДЦ1 (зав. № 30203102), 2010 г. в. | 30672,00 | 3067,20 | 1533,60 |

В отношении вышеуказанного имущества проводятся первые повторные торги. Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 163 (29785) от 20.08.2022, стр. 10

**Местонахождение:**
Минская обл., Борисовский р-н, Метченский с/с, вблизи д. Старая Метча.
**GPS-координаты: 54.179354, 28.711073**

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **12 октября 2022 года в 12.00 (регистрация – с 11.30 до 11.55) по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127** |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | **С 10.00 29 сентября 2022 года до 16.00 10 октября 2022 года** |

**Условия для участия в торгах:**

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA 30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту «__», ООО «Мётча Агро», проводимых 12.10.2022.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления являются дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – 7 % от конечной цены предмета торгов.** Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) календарных дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 15 (пятнадцати) календарных дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info/.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов – **Андрей, +375293042560.**
8. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Все мероприятия, связанные со снятием имущества с учета в уполномоченном государственном органе, осуществляет покупатель собственными силами и за свой счет на основании выданной доверенности.

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **ООО «Мётча Агро» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел.: +375293110464, 80173958917 (Минская обл., Борисовский р-н, Метченский с/с, д. Старая Метча, ул. Почтовая, д. 1, УНП 190564818)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера», 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127, ☎ тел. 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

# ВАЖНА НЕ МАЎЧАЦЬ

## Як не стаць ахвярай хатняга гвалту і чаму не варта пакрываць сямейнага дэбашыра?

**У каго, скажыце, хоць раз не здараўся сямейны скандал?! Гэтым, маўляў, сёння нікога не здзівіш: людзі ўлюбляюцца, бяруць шлюб, сварацца... Аднак не толькі сваркі сужэнцаў час ад часу (а можа, і часцей) ствараюць дыскамфорт суседзям. Вечны канфлікт бацькоў і дзяцей таксама нярэдка праяўляецца павышаным тонам і нават рукапрыкладствам. Добра яшчэ, калі ўсё заканчваецца мірна. На жаль, не абыходзіцца падчас сямейных сварак і без трагедый...**

Ахвярай хатняга гвалту можа стаць кожны. Хто з людзей знаходзіцца ў зоне рызыкі, вызначыць не так проста. І калі падобнае здараецца на фоне п'янства кагосьці з членаў сям'і, зразумела, што віной усяму з'яўляецца алкаголь. Трагедыі ж, якія адбываюцца падчас сямейнага канфлікту ў прыстойных, станоўчых, здавалася б, сем'ях, увогуле не паддаюцца ніякай аргументацыі. Як не стаць ахвярай гвалту ў сябе ж дома і як не дапусціць непапраўнага, расказаў **намеснік начальніка ўпраўлення прафілактыкі — начальнік аддзела арганізацыі работы ўчастковых інспектараў міліцыі галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі МУС маёр міліцыі Канстанцін РУЦ.**

*— Якія меры органамі ўнутраных спраў прымаюцца па зніжэнні крымінагенных рызык, калі гаворка ідзе пра хатні гвалт?*

— У першую чаргу, гэта прафілактычнае ўздзеянне ў адносінах да канкрэтных катэгорый грамадзян, прэвентыўныя меры па прадухіленні дадзенай праблемы. Мы робім усё дзеля таго, каб не дапусціць цяжкіх наступстваў, у прыватнасці, здзяйснення цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынстваў супраць жыцця і здароўя чалавека. І гэта не прыгожыя словы. Статыстыка сведчыць: за восем месяцаў бягучага года адзначаецца зніжэнне зарэгістраваных забойстваў і наўмысных цяжкіх цялесных пашкоджанняў у сферы хатняга гвалту ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Праблема хатняга гвалту не новая, яна не ўзялася з ніадкуль.

«Крызісныя пакоі ёсць у кожным рэгіёне краіны. Калі ахвяры хатняга гвалту няма куды пайсці, яна там можа правесці столькі часу, колькі неабходна для прыцягнення сямейнага дэбашыра да адказнасці, або пакуль не супакоіцца сітуацыя».

*— У ліпені ўступілі ў сілу змяненні ў Закон «Аб асновах дзейнасці па прафілактыцы правапарушэнняў». Чым выкліканы заканадаўчыя папраўкі і якія навацыі прадугледжаны?*

— Змяненні найперш выкліканы практыкай, жыццём. Папярэдняя рэдакцыя закона была прынята ў 2014 годзе. За гэты час шмат што змянілася. У МУС сур'ёзна прааналізавалі практыку прымянення мер індывідуальнай прафілактыкі і прыйшлі да высновы, што



перш-наперш неабходна перагледзець падыходы да ажыццяўлення прафілактычных улікаў у адносінах да грамадзян. Калі папярэдняй рэдакцыяй закона прадугледжвалася два віды прафуліку (за бытавыя правапарушэнні і правапарушэнні, здзейсненыя ў стане алкагольнага ап'янення), то ў новай рэдакцыі закона мы вырашылі адмовіцца ад прафуліку п'яніц — цяпер мы будзем працаваць з імі ў кірунку адпраўлення іх у лячэбна-працоўны прафілакторый. Асноўны ўпор у законе зрабілі на прафілактычны ўлік у адносінах да асоб, якія ажыццяўляюць правапарушэнні ў сферы хатняга гвалту.

*— Хто можа аказацца на такім уліку?*

— Асоба, якая здзейсніла адміністрацыйнае правапарушэнне ў адносінах да блізкага сваяка, члена сям'і, былога члена сям'і. На прафілактычны ўлік могуць быць пастаўлены грамадзяне, у адносінах да якіх праводзіцца праверка ў адпаведнасці з патрабаваннямі Крымінальна-працэсуальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь за здзяйсненне супрацьпраўных дзеянняў у сферы хатняга гвалту. Напрыклад, калі паступіла паведамленне аб пагрозе забойства з боку мужа ці жонкі, мы распачынаем крымінальны працэс, устанаўліваем абставіны, даказваем факт здзяйснення злачынства. Натуральна, маюцца падставы для пастаноўкі дадзенай асобы на ўлік.

*— Новаўвядзенні закранулі і такі інструмент індывідуальнай прафілактыкі правапарушэнняў, як абароннае прадпісанне...*

— Калі ў мінулай рэдакцыі закона мы мелі права прымяняць яго да 30 сутак, то згодна з абноўленым варыянтам, мы прымяняем абароннае прадпісанне да 15 сутак. Калі ў сям'і складваецца такая сітуацыя, што яго неабходна працягнуць да 30 сутак, звяртаемся да пракурора, які прымае рашэнне, зыходзячы з асобы падазраванага. Па-ранейшаму на прымяненне абароннага прадпісання павінна быць дадзена згода ахвяры хатняга гвалту. Аднак калі супрацоўнік міліцыі бачыць, што сітуацыя ў сям'і няпростая (ахвяра адмаўляецца, бо знаходзіцца ў залежнасці ад сямейнага гвалтаўніка) і ўзровень крымінагеннай рызыкі ў сям'і высокі, абароннае прадпісанне прымяняецца без згоды пацярпелага.

*— Што ўяўляе такая мера індывідуальнай прафілактыкі, як карэкцыйная праграма?*

— У тэхнічным плане мы не адстаём ад усіх сфер грамадства. Законам прадугледжана вядзенне і функцыянаванне рэестра ўліку фактаў хатняга гвалту. Гэта своеасаблівая электронная сістэма, абслугоўваць якую будзе Міністэрства ўнутраных спраў. Аднак карыстацца ёй змогуць усе зацікаўленыя суб'екты прафілактыкі: Міністэрства аховы здароўя, Міністэрства працы і сацыяльнай абароны і іншыя ведамствы. Акрамя таго, у іх будзе магчымасць уносіць інфармацыю ў дадзены рэестр шляхам атрымання звестак непасрэдна ад асобы. Напрыклад, жанчына прыходзіць да ўрача на прыём і расказвае сітуацыю, што муж яе пабіў. Урач праінфармуе аб тым сваё кіраўніцтва, і адпаведная інфармацыя будзе ўнесена ў рэестр уліку інфармацыі. Гэтыя факты трапяць і да нас, у выніку чаго распачнецца праверка. Калі на тое будуць падставы, сямейны дэбашыр прыцягнецца да адказнасці. Абавязкова адрэагуем і тады, калі ў рэестр паступіць інфармацыя ад установы сацыяльнай абароны



насельніцтва на прадмет таго, што ў канкрэтнага пенсіянера сын-п'яніца забірае пенсію.

*— А што сёння можна разумець пад хатнім гвалтам? Гэта ж, напэўна, не толькі класічнае падыманне рукі мужа на жонку?*

— Ёсць розныя выгляды хатняга гвалту. Як правіла, у нас стэрэатып: муж — скандаліст, жонка — пацярпелая. Хоць, як паказвае практыка, дастаткова часта бывае наадварот. Што такое фізічны гвалт, думаю, тлумачыць не трэба. Калі ж, напрыклад, муж абражае жонку, зневажае яе гонар і годнасць, у такім выпадку мы кажам пра псіхалагічны гвалт. А яшчэ змяненнямі Закона «Аб прафілактыцы» ўведзены тэрмін «сексуальны гвалт». Гэта замах на палавую свабоду або палавую недатыкальнасць насуперак волі ахвяры.

*— Атрымаўшы цялесныя пашкоджанні, як правіла, ахвяры сямейных канфліктаў паведамляюць аб гэтым у міліцыю. А наколькі органы ўнутраных спраў інфармаваныя аб выпадках псіхалагічнага гвалту?*

— З практыкі ўчастковага інспектара я заўважыў такую рэч: калі прыходзіш на паведамленне аб фізічным гвалце, аказваецца, што ў большасці выпадкаў людзі з'яўляюцца ахвярамі псіхалагічнага ўздзеяння. Гэта абразы, пагрозы, нецэнзурная лексіка, шантаж — дзеянні правапарушальніка так уздзейнічаюць на ахвяру, каб яна адчула сябе прыгнечанай у маральным плане. Гэта і ёсць псіхалагічны гвалт. У такіх выпадках не толькі міліцыя з'яўляецца суб'ектам прафілактыкі правапарушэнняў. Сюды падключаюцца ўсе зацікаўленыя органы: прадстаўнікі Міністэрства аховы здароўя, псіхолагі. Свае магчымасці прадастаўляюць крызісныя пакоі, куды, калі ёсць такая неабходнасць, адпраўляецца пацярпелы.

*— Ці кожны, калі ёсць у гэтым неабходнасць, можа атрымаць там прыстанішча?*

— Крызісныя пакоі ёсць у кожным рэгіёне краіны. Калі ахвяры хатняга гвалту няма куды пайсці, яна там можа правесці столькі часу, колькі неабходна для прыцягнення сямейнага дэбашыра да адказнасці, або пакуль не супакоіцца сітуацыя. Другая найбольш эфектыўная форма ўздзеяння на сямейнага дэбашыра — прымяненне абароннага прадпісання, калі ён на тэрмін ад 15 да 30 сутак ізалюецца ад сям'і. Многія хатнія парушальнікі задумваюцца і выпраўляюцца — у выніку ў сям'і наладжваюцца адносіны. Дзесьці ў 40 % людзі разыходзяцца. У астатніх выпадках п'яніца (як правіла, скандаляць дома менавіта тыя, хто злоўжывае алкаголем) накіроўваецца ў ЛПП.

*— Чаму ў некаторых сем'ях, якія сутыкнуліся з праблемай хатняга гвалту, сітуацыя не вырашаецца?*

— Ахвярам хатняга гвалту становіцца шкада сваіх мужоў, братоў, іншых сваякоў, і яны ім даруюць. А для прыцягнення да адміністрацыйнай адказнасці ў любым выпадку неабходная заява ад пацярпелай асобы. Дэбашыр, бачачы сваю беспакаранасць, зноў ідзе на нядобрыя ўчынкі. У такіх выпадках з пацярпелымі вядуцца размовы аб тым, што трэба прымаць канкрэтныя меры, у тым ліку адміністрацыйнае ўздзеянне.

*— Такія сем'і, у якіх яшчэ выхоўваюцца дзеці, напэўна, у вас на асаблівым кантролі?*

— Калі супрацоўнік міліцыі выбывае на паведамленне аб хатнім гвалце і ўстанаўлівае факт знаходжання ў такіх сем'ях непаўналетніх дзяцей, аб гэтым абавязкова інфармуюцца органы апекі і папячыцельства — гэта камісіі па справах непаўналетніх пры выканкамах. Адпаведныя звесткі даводзяцца і да інспекцыі па справах непаўналетніх. Калі абое бацькоў уяўляюць пагрозу для свайго дзіцяці, то апошняе адбіраецца з сям'і. Калі ў сем'ях, дзе фіксуюцца факты хатняга гвалту, пражываюць пажылыя людзі, аб гэтым абавязкова апавяшчаюцца тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнай абароны насельніцтва.

*— Як пазбегнуць трагічных наступстваў на фоне хатняга гвалту?*

— Галоўнае — не маўчаць. У першую чаргу, інфармаваць аб падобных выпадках міліцыю. Калі замоўчваць праблему, можна і жыццём потым паплаціцца. Не трэба саромецца звяртацца па дапамогу ў праваахоўныя органы. Нават калі штосьці не ў нашай кампетэнцыі, мы праінфармуем іншыя дзяржаўныя органы і пракантралюем, ці вырашылася пытанне, з якім вы да іх звярнуліся. Лепш прадугледзець усе моманты, а не чакаць, пакуль паводзіны сямейнага дэбашыра выльюцца ў калецтва або, не дай бог, смерць.

# СТОП, НАРКОТЫКІ!

Па-ранейшаму для нашай краіны застаецца вострай праблема ўцягвання дзяцей у незаконны абарот наркотыкаў. Для прыцягнення ўвагі грамадскасці да згаданага пытання Міністэрствам унутраных спраў сумесна з міністэрствамі адукацыі, аховы здароўя і інфармацыі ў перыяд з 20 да 30 верасня праводзіцца інфармацыйная акцыя «Наркотыкі. Адказнасць. Наступствы». Асноўная задача зацікаўленых ведамстваў — расказаць непаўналетнім і іх бацькам аб прававых і медыцынскіх наступствах ужывання і распаўсюджвання наркотыкаў.

Па ўсёй краіне праводзяцца мерапрыемствы, мэта якіх — дайсці да кожнага дзіцяці і яго бацькоў, растлумачыць тую небяспеку, якую хавае ў сабе ўдзел у наркабізнесе. Як паведамляюць праваахоўнікі, сёння наркадылеры актыўна выкарыстоўваюць дзяцей, прапануючы ім грошы не толькі за распаўсюджванне наркотыкаў, але і за выкарыстанне сваіх сяброў у якасці так званых закладчыкаў.

Асноўным спосабам вярбоўкі па-ранейшаму застаецца рэклама ў інтэрнэце. Пры гэтым на падлеткаў уздзейнічаюць аргументамі, што яны застануцца незаўважанымі, калі будуць выконваць правілы канспірацыі, выкарыстоўваць спецыяльныя дадаткі, якія забяспечаць ананімнасць. Могуць паабяцаць гандаль легальнымі стымулятарамі, а насамрэч даручаць распаўсюджваць асабліва небяспечныя псіхатропныя рэчывы. Пры гэтым важна нагадаць, што крымінальная адказнасць за збыт наркотыкаў надыходзіць з 14 гадоў. Максімальнае пакаранне прадугледжвае да 25 гадоў пазбаўлення волі.

Профі

# НА ПЕРАДАВОЙ БАРАЦЬБЫ СА ЗЛАЧЫННАСЦЮ

## У МУС вызначылі пераможцаў рэспубліканскага агляду-конкурсу на званне найлепшага супрацоўніка крымінальнага вышуку

**Аднак найперш прадстаўнікам органаў унутраных спраў давялося прайсці шэраг выпрабаванняў. За два конкурсныя дні міліцыянеры не толькі праверылі свае веды, а і ўдасканалілі іх. Таксама правааховнікі пазнаёміліся адно з адным, наладзілі службовыя зносіны — нярэдка дапамога калег з іншага рэгіёна можа спатрэбіцца падчас расследавання крымінальнай справы.**

Змагаючыся за лідарства, канкурсанты прадэманстравалі свае веды тактыка-спецыяльнай падрыхтоўкі, аператыўна-пошукавай дзейнасці і крыміналістыкі. Ва ўмовах, максімальна набліжаных да рэальных, супрацоўнікі крымінальнага вышуку паказалі, як неабходна працаваць на месцы здарэння. Пазмагаліся міліцыянеры і ў аратарскім майстэрстве: яны пастаянна працуюць з людзьмі, таму ўменне правільна данасіць інфармацыю — адна з найважнейшых якасцяў вартавых правапарадку. А ў меткасці ім увогуле не павінна быць роўных: сышчыкі ўпэўнена даказалі гэта падчас спаборніцтва па агнявой падрыхтоўцы. Іх выдатную спартыўную форму журы ацаніла ў выпрабаванні па фізічнай падрыхтоўцы.

Па выніках агляду-конкурсу на званне найлепшага супрацоўніка крымінальнага вышуку пераможцам стаў **старшы оперупаўнаважаны аддзела крымінальнага вышуку Савецкага РАУС Гомеля маёр міліцыі Аляксандр ЮРЧАНКА**. Дарэчы, гэта трэцяя перамога сышчыка ў прафесійным выпрабаванні. У міліцыі малады чалавек — 15 гадоў (гэта з улікам навучання ў Акадэміі МУС). Усю сваю прафесійную дзейнасць ён служыць у крымінальным вышуку. Раней жа такі адказны ўчастак работы ўчарашнім выпускнікам davяралі нячаста: спачатку трэба было набрацца вопыту ў іншых падраздзяленнях органаў унутраных спраў. Цяпер важныя справы даручаюць і маладым афіцэрам, якія з першых дзён паказваюць прафесіяналізм.

— Супрацоўнікі крымінальнага вышуку стаяць на перадавой барацьбы са злачыннасцю, — адзначае Аляксандр Юрчанка. — Сапраўды, у міліцыі гэта самая складаная работа.

Апошнім часам афіцэр займаецца выяўленнем злачынстваў у сферы аўтабізнесу. Расказаць пра паспяховыя раскрыцці крымінальных спраў адмовіўся. І не таму, што гэта службовая таямніца. Аляксандр пабаяўся пакрыўдзіць калег, бо кожная раскрытая справа, па яго словах, — калектыўная работа, таму расказваць толькі пра сябе, сама меншей, нясціпла.



Пераможцы рэспубліканскага агляду-конкурсу на званне найлепшага супрацоўніка крымінальнага вышуку.

**Оперупаўнаважаны аддзялення крымінальнага вышуку крымінальнай міліцыі аддзела ўнутраных спраў Зэльвенскага райвыканкама капітан міліцыі Дзмітрый ЛАТУШКА** таксама ўдзельнічае ў конкурсе не ўпершыню. Летась на рэспубліканскім этапе правааховнік заняў трэцяе месца, сёлета ж малады чалавек стаў другім. Міліцыянер жартуе, што калі Аляксандр Юрчанка, які стаў пераможцам, не прыедзе на конкурс налета, то «золата» можа дастацца яму.

У крымінальны вышук Дзмітрый трапіў адразу па размеркаванні. Шосты год займаецца раскрыццём злачынстваў на Зэльвеншчыне. Быць сышчыкам малады чалавек марыў яшчэ са школы. Для яго, вясковага хлопца, які любіў глядзець савецкія фільмы пра міліцыянераў, гэта здавалася нават нечым нерэальным. Аднак ён упэўнена ішоў да сваёй мэты — у выніку сёння займаецца любімай справай.

— Гэта вельмі адказна, бо даводзіцца працаваць па ўсіх кірунках, — удакладняе дэталі Дзмітрый Латушка. — У маленькім аддзеле, як у нас, даводзіцца займацца ўсім: пачынаючы ад расследавання забойства, заканчваючы крадзяжом індыкоў. Аднак такая разнастайнасць у службовай дзейнасці толькі дазваляе прафесійна ўдасканальвацца і набірацца вопыту.

Нярэдка даводзіцца чуць, што працаваць у крымінальным вышуку — не жаночая справа. З гэтым нязгодная бронзавы прызёр конкурсу **маёр міліцыі Ірына МАЛЯНОК**, якая служыць **старшым оперупаўнаважаным аддзела крымінальнага вышуку Савецкага РАУС Гомеля**. Ірына, дарэчы, адзіная жанчына, якая ўдзельнічала ў конкурсе прафесійнага майстэрства, пры гэтым яна апярэдзіла многіх калег-мужчын.

У крымінальны вышук Ірына Малянок прыйшла адразу па заканчэнні Акадэміі МУС і ў сваім аддзеле стала адзінай жанчынай на гэтым адказным участку работы. Сапраўды, да нядаўняга часу гэта была ў асноўным мужчынская вотчына: ненармаваны рабочы дзень, спецыфічны кантынгент, з якім рэгулярна маюць узаемаадносіны спецыялісты крымінальнага вышуку, накладаюць свой адбітак. Сучасныя супрацоўніцы органаў унутраных спраў даказваюць, што выдатна могуць сумяшчаць хатнія абавязкі са службай.

Ірына займаецца пошукам грамадзян, якія зніклі без вестак. Гэта, па яе словах, няпроста, нават з улікам высокіх тэхналогій. Аднак дзякуючы свайму прафесіяналізму сучасныя сышчыкі здольныя на многае, што пацвярджаюць вынікі агляду-конкурсу.

**Фота прэс-службы МУС.**

Май на ўвазе

# АБАЗНАЧЦЕ СЯБЕ І ЗАБУДЗЬЦЕ ПРА ГАДЖЭТЫ

## На што варта звярнуць увагу пешаходам

**З кожным восеньскім днём вечары становяцца ранейшымі, а віднее пазней, чым звычайна. Самы час задумацца аб флікерах. Засцерагчы сябе святлоадбівальнымі элементамі пешаходам і веласіпедыстам варта ўжо цяпер.**

Вялікая прафілактычная работа па папулярызацыі выкарыстання святлоадбівальных элементаў і камізэлек павышанай бачнасці ў цёмны час сутак, увогуле па папярэджанні дарожна-транспартных здарэнняў з удзелам уразлівых удзельнікаў дарожнага руху праводзіцца органамі ўнутраных спраў. Праблема дарожна-транспартнага траўматызму па-ранейшаму застаецца адной з найбольш вострых у арганізацыі бяспекі дарожнага руху.

Аналіз ДТЗ, якія адбыліся ў краіне сёлета за восем месяцаў, сведчыць аб тым, што каля 30 % аўтааварый звязана з наездамі на пешаходаў, у якіх 99 чалавек загінулі і 488 атрымалі раненні. Пры гэтым па віне пешаходаў здзейснена 187 дарожна-транспартных здарэнняў (загінула 56 чалавек, 135 грамадзян паранена). Па віне веласіпедыстаў адбылося 91 ДТЗ (пяцёра загінулі, 88 чалавек паранена).

Як адзначаюць у органах унутраных спраў, асноўнымі прычынамі і ўмовамі, якія ўплываюць на здзяйсненне дарожна-транспартных здарэнняў з удзелам пешаходаў, з'яўляюцца знаходжанне пешахода ў стане алкагольнага ап'янення, пераход дарогі ў неўстаноўленым месцы, непадпарадкаванне сігналам рэгулявання дарожнага руху, а таксама нечаканы выхад на праезную частку з-за перашкод, якія абмяжоўваюць агляданне.

— Людзі заўсёды кудысьці спяшаюцца, дзеці забываюцца аб усім падчас гульні, а дарога неабачлівасці не даруе, — заўважае **начальнік арганізацыйна-аналітычнага ўпраўлення міліцыі грамадскай бяспекі МУС палкоўнік міліцыі Вадзім ПЕТЫШ**. — Безумоўна, на пераходзе пешаход мае перавагу перад аўтамабілем. Аднак важна не забываць, што транспартны сродак — гэта ўсяго толькі механізм, які не ў стане спыніцца імгненна і, у рэшце рэшт, можа зламацца. Калі для ўладальніка аўтамабіля шкода ад аўтааварыі будзе вымярацца коштам рамонтных работ, то для пешахода такая «сустрэча» можа скончыцца цяжкім калецтвам або гібеллю. Вельмі часта маладыя людзі пры руху па вуліцах, пераходзе праезнай часткі дарогі «губляюцца» ў сваіх гаджэтах і не ацэньваюць навакольнае становішча, што можа пацягнуць за сабой цяжкія наступствы. У сувязі з гэтым, незалежна ад таго, ходзяць дзеці па вуліцы пешшу, ездзяць на веласіпедзе або карыстаюцца грамадскім транспартам, бацькам варта навучаць іх правілам бяспекі на дарогах.

Сваю ролю ў выхаваўчы працэс уносяць і міліцыянеры, якія праводзяць шматлікія акцыі, рэйды, перш за ўсё накіраваныя на папярэджанне магчымых трагедый з удзелам пешаходаў. На асаблівым кантролі — непаўналетнія ўдзельнікі дарожнага руху. Дарэчы, у бягучым годзе з удзелам непаўналетніх зарэгістраваны 254 дарожна-транспартныя здарэнні, у якіх загінулі 10 дзяцей, 263 юныя грамадзяне атрымалі раненні. Пры гэтым удзельнікамі ста ДТЗ сталіся дзеці-пешаходы, пяцідзесяці — дзеці-веласіпедысты.

Праблема дарожна-транспартнага траўматызму з удзелам уразлівых удзельнікаў дарожнага руху становіцца яшчэ больш актуальнай з надыходам асенне-зімовага перыяду, з улікам скарачэння светлавога дня. Усе сітуацыі, калі пешаход абавязаны насіць святлоадбівальныя элементы, а таксама калі яму гэта рэкамендуецца, прапісаны ў чацвёртым раздзеле ПДР «Правы і абавязкі пешаходаў». У прыватнасці, адзін з пунктаў правілаў абвяшчае, што пры руху па краі праезнай часткі дарогі ў цёмны час сутак пешаход павінен абазначыць сябе святлоадбівальным элементам (элементамі). Пры перасячэнні праезнай часткі дарогі па-за падземным, надземным, наземным пешаходнымі пераходамі і скрыжаваннем у цёмны час сутак пешаходу рэкамендуецца абазначыць сябе святлоадбівальным элементам (элементамі).

Калі ігнараваць такое патрабаванне, можна атрымаць штраф у памеры ад 1 да 3 базавых велічынь, а знаходзячыся ў стане алкагольнага ап'янення — ад 3 да 5. Аднак выкарыстанне святлоадбівальных элементаў у цёмны час сутак як у сельскай мясцовасці, так і ў горадзе, павінна быць выклікана не страхам атрымання штрафу, а, у першую чаргу, павышэннем уласнай бяспекі пры ўдзеле ў дарожным руху, захаваннем жыцця і здароўя.

**Каб пазбегнуць няшчаснага выпадку на дарозе, неабходна:**

— пры руху на вуліцы быць максімальна сканцэнтраванымі;

— хадзіць па тратуары з правага боку;

— катацца на роліках, скейтбордах, веласіпедах, самакатах толькі ў месцах, прызначаных для гэтага;

— пры пераходзе праезнай часткі спыніцца і паглядзець, ці няма блізка аўтамабіля;

— перасякаць дарогу толькі на зялёнае святло і толькі па пешаходным (пры яго адсутнасці — надземным, падземным) пераходзе;

— чакаць грамадскі транспарт выключна на пасадачных пляцоўках або абочынах;

— не перабягаць дарогу перад транспартам, які набліжаецца;

— пазбягаць гульняў на праезнай частцы і каля яе.

**Матэрыялы выпуску падрыхтавала Вераніка КАНЮТА.**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец имущества) в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснёва Н.М. извещает о проведении 19 октября 2022 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 75 % по продаже ДЕБИТОРСКОЙ ЗАДОЛЖЕННОСТИ в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб. | Шаг аукциона – 5 %, бел. руб. | Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| **1** | ООО «Гомельская Инжиниринговая Компания» – управляющая компания холдинга «Стройинжиниринг Групп», УНП 491325521 | 76,65 | 3,83 | **7,66** |
| **2** | ЧСУП «Рубеж Систем», УНП 491060084 | 1 791,01 | 89,55 | **179,10** |
| **3** | Лукское ОАО, УНП 490086076 | 16 706,69 | 835,33 | **1 670,67** |
| **4** | КСУП «Новый путь-агро», УНП 400001758 | 7 123,56 | 356,18 | **712,36** |

**Продавец:** ОАО «Гомельоблстрой», г. Гомель, ул. Малайчука, 12.

**Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8 (029) 185-37-18 – управляющий в деле о банкротстве Колеснёв Николай Михайлович. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Гомельоблстрой»)**: р/с BY73 BLBB 3012 0400 0516 9300 1001, в Головной ф-л по Гомельской области ОАО «Белинвестбанк», БИК BLBBBY2X, УНП 400051693, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 29 сентября 2022 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 17 октября 2022 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за **5 (пять) дней** до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене**, увеличенной на 5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента его подписания и возместить затраты и расходы на организацию и проведение аукциона в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-3 (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)», ст. 127–129.

**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 21.06.2022 г. № 119 (29741). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by раздел «Аукционы» или www.gomeloblreklama.by, www.bankrot.gov.by. Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-53, 8 (029) 651-22-19, 8 (044) 599-18-16.**

## БЕЛАРУЧСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
### сообщает о проведении 4 ноября 2022 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

| Номер лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь, га | Инженерная и транспортная инфраструктура | Начальная цена (бел. руб.) | Расходы по подготовке документации (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Аукцион по продаже земельных участков гражданам в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов | | | | | | |
| 1 | Минская область, Логойский район, **д. Тукаловка**, участок У-4, кадастровый номер **623280408601000023**, целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 0,1500 | Возможность подключения к электроснабжению, подъезд с грунтовой дороги | 5000 | 81,00 + публикация в газете | 500 |
| 2 | Минская область, Логойский район, **д. Семково**, У-1А, кадастровый номер **623284600001000016**, целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 0,103 | Возможность подключения к электро-, газоснабжению; грунтовая дорога | 8000 | 2145,42 + публикация в газете | 800 |
| 3 | Минская область, Логойский район, **д. Мочаны**, ул. Подгорная, У-2, кадастровый номер **623284600001000014**, целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 0,1483 | Необходимо строительство ВЛ-0.4кВ от КТПП № 720 есть возможность подключения к газоснабжению, грунтовая дорога | 18000 | 2196,04 + публикация в газете | 1800 |

Задаток (10 % от начальной цены) перечисляется на расчетный счет № BY97AKBB36006190111210000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» БИК банка AKBBBY2X, код платежа 4901, УНН 600537220 (600181549), получатель – Беларучский сельский исполнительный комитет.

Для участия в аукционе необходимо:

Подать заявление об участии в аукционе в комиссию по организации и проведению аукционов.

Представить квитанцию об оплате суммы задатка.

Представить паспорт и копию его страниц, содержащих идентификационные сведения, либо нотариально удостоверенную доверенность.

Заключить соглашение с местным исполнительным комитетом.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией и с земельными участками, выставляемыми на аукцион. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Условия: аукцион проводится при наличии двух и более участников. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона.

Затраты на строительство, в том числе проектирование обьектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельному участку, подлежит возмещению в порядке и случаях, предусмотренных постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 № 298 «Об утверждении Положения о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в том числе проектирование, обьектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку» в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 07.02.2006 № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, обьектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры».

Аукцион состоится **4 ноября 2022 года в 10.00** по адресу: Минская область, Логойский район, д. Алекшицы, ул. Центральная, д. 17.

Заявления на участие принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: Минская область, Логойский район, д. Алекшицы, ул. Центральная, д. 17. Последний день приема заявлений – **31 октября 2022 года до 17.00.** Контактные телефоны: **(801774) 28636, 28935.**

## ОКОЛОВСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
### сообщает о проведении 31 октября 2022 года открытого аукциона по продаже земельных участков на территории Логойского района

| Номер лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь, га | Инженерная и транспортная инфраструктура | Начальная цена, бел. руб. | Расходы по подготовке зем. документации | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Аукцион по продаже земельного участка в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | | | | | | |
| 1 | **Минская область, Логойский район, Околовский сельсовет, д. Заборье, У-1,** земельный участок с кадастровым номером 623285402101000040, целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 0,25 | Возможность подключения к электроснабжению, имеется подъездная грунтовая дорога | 3100,00 | Публикация в газете + 2 286,73 руб. | 310,00 |
| 2 | **Минская область, Логойский район, Околовский сельсовет, д. Заборье, У-2,** земельный участок с кадастровым номером 623285402101000041, целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 0,2499 | Возможность подключения к электроэнергии имеется подъездная грунтовая дорога | 3100,00 | Публикация в газете + 2 291,94 руб | 310,00 |

Затраты на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам, подлежат возмещению в порядке и случаях, предусмотренных в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 7 февраля 2006 г. № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры» и Положения о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.20014 г. № 298 (питьевое водоснабжение 1558,58 руб./(1 куб. м/сут.); электроснабжение 1628,45 руб./1 кВт).

*Задаток (10 % от начальной цены) перечисляется на расчетный счет (IBAN) BY53AKBB36006191211090000000 в «ОАО АСБ Беларусбанк», код банка (BIC) AKBBBY2X, код платежа – 04901, получатель – Околовский сельский исполнительный комитет, УНП 600181669, ОКПО 04431582.*

Для участия в аукционе необходимо:

1. Подать заявление об участии в аукционе в комиссию по организации и проведению аукционов.
2. Представить квитанцию об оплате суммы задатка.
3. Предъявить документ, удостоверяющий личность, либо доверенность, выданную в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия должностного лица.
4. Заключить соглашение с местным исполнительным комитетом или по его поручению с государственной организацией по проведению аукционов.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией и с земельными участками, выставляемыми на аукцион. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

**Аукцион состоится 31 октября 2022 года в 10.00 по адресу: Минская область, Логойский район, д. Околово, д. 52.**

**Заявление на участие и необходимые документы принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.**

**Последний день приема заявлений – 25 октября 2022 года до 17.00.**

**Контактные телефоны: 8 (01774) 51-7-35, 72-1-58.**

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор электронных торгов** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ГОЛХУ «Осиповичский опытный лесхоз», 213765, Могилевская обл., г. Осиповичи, ул. Проектируемая, 12, тел. +375 2235-51805** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов: транспортные средства, спецтехника, бывшее в употреблении**

| Лот № | Инв. номер | Наименование | Начальная цена, с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | 01250026 | **Автобус-вагон MAZ 256270**, 2009 г. в., рег. знак ТА-7744, № кузова Y3M25627090001452 | 14 952,00 |
| 2 | 01240536 | **Машина погрузочно-транспортная МПТ 461.1** в составе: **Трактор «Беларус Л 82.2»,** 2012 г. в., рег. знак ТВ-6 5569, серийный № 72001827 | 25 368,00 |
| | 01240536 | **Полуприцеп ПЛ-9, 2012 г. в.,** рег. знак ТВ-6 5570, серийный № 427 | |

Шаг электронных торгов составляет пять процентов от начальной цены предмета электронных торгов (по каждому лоту)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (BYN), БИК BELBBY2X. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки». УНП 191 021 390. **Срок внесения задатка по 13.10.2022 г.**

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 11.10 14.10.2022.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее, чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **13.10.2022** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

**Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на сайте Государственного комитета по имуществу от 29.09.2022 г.**

**Контактные телефоны:** +375 (17) 280-36-37; +375 (44) 704-92-06. **E-mail:** auction@cpo.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Открытое акционерное общество
## «Дорожно-строительный трест № 3»
**03 ноября 2022 года в 11.00**
проводит открытый аукцион по продаже имущества

| № п/п | Сведения о предмете аукциона | Начальная цена продажи без НДС, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| Лот № 1 | **Трактор К-701,** заводской номер 8702588, год выпуска 1987, регистрационный знак ТВ-6 9978, инвентарный номер 873 | 16 200,00 | 1620,00 |
| Лот № 2 | **Автогрейдер ДЗ-98 В 7.2,** заводской номер 3150СП, год выпуска 2001, регистрационный знак 9188 БЮ, инвентарный номер 383 | 33 400,00 | 3340,00 |

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его местонахождение и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел. 802220712424.
2. Дата, время и место проведения аукциона: **03 ноября 2022 года в 11.00** по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, конференц-зал.
3. Местонахождение имущества: лот № 1 – г. Костюковичи, ул. Кулешова, 17А, лот № 2 – г. Кричев, ул. Комсомольская, 126.
4. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящегося в собственности ОАО «ДСТ № 3» (утвержденное приказом генерального директора № 5 от 03.01.2022).
5. Участник аукциона за 3 рабочих дня до проведения аукциона должен подать заявление на участие в аукционе, подписать с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, а также перечислить организатору аукциона задаток в размере 10 % от первоначальной стоимости без НДС. Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с BY54BPSB30121192410119330000, код BPSBBY2X в ОАО «Сбер Банк», УНП 700049607.
6. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: 212022, г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: **28.10.2022 г., время: 17.00**.
7. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.
8. Сроки подписания договора купли-продажи: Договор купли-продажи имущества должен быть подписан победителем аукциона (претендентом на покупку) в редакции организатора аукциона после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и предоставления организатору аукциона копий платежных документов, но не позднее 5 рабочих дней.
9. Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона: в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола.
10. Извещение опубликовано в газете «Звязда», а также на сайте ОАО «ДСТ № 3».

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
### извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Тепличный комбинат Мачулищи»

Аукцион состоится **20.10.2022 в 11.00**
по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

## Лот № 1: Когенерационная установка JMS 620GS-N.L

производства австрийской фирмы «JenBacher», состоящей из двух модулей, 2009 г. в.

**Адрес: Минский р-н, г.п. Мачулищи, ул. Солнечная, 6.**
**Начальная цена с НДС – 5929200,00 руб.**
**Задаток – 200000,00 руб. Шаг аукциона – 5 %.**

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – ino.by.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений и задатка – **18.10.2022 в 11.00.**

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

29 ВЕРАСНЯ 2022 г.
ЧАЦВЕР
№ 16 (15939)

Выдаецца
з 21 красавіка 1921 года

*Фабрыка зорак*

**Прадзюсарскі цэнтр «СПАМАШ»:**

# «Наша задача — зрабіць артыста»

**«У рабоце з дзецьмі заўсёды кіруюся думкай, што ты фарміруеш чалавека. І важна даць яму прыклад лепшага жыцця», — кажа дырэктар прадзюсарскага цэнтра «СПАМАШ» Анжаліна МІКУЛЬСКАЯ. Калі мы бачым на сцэне бездакорныя выступленні артыстаў — ад самых маленькіх да вопытных прафесіяналаў, — не заўсёды задумваемся пра тое, што папярэднічае такому іх выніку. Каб даведацца, як адбіраюць таленты, ці ўсе праходзяць «дыстанцыю» да сапраўднага поспеху і якая ў яго цана, мы наведаліся ў сталічную «фабрыку зорак»...**



Сёлета ў перыяд папярэдніх праслухоўванняў тут атрымалі больш за 380 заявак ад ахвотных стаць часткай вялікай творчай сям'і студыі мастацтваў «Malinovka by Spamash». Але можа толькі ў 120 шчаслівчыкаў з'явіцца шанец распачаць свой шлях да пошуку запаветнага месца пад сонцам на беларускай эстрадзе. Праўда, не заўсёды сюды прыводзяць дзетак менавіта з мэтай стаць знакамітымі, бо тут іх чакаюць самыя рознапланавыя заняткі, якія дапамагаюць кожнаму дзіцяці адчуць свабоду творчага самавыяўлення, спасцігнуць майстэрства вакальнага, харэаграфічнага і прамоўніцкага майстэрства, а значыць, атрымаць, перш за ўсё, магчымасць гарманічна развіваць свае здольнасці і моцныя бакі.

— У нашай школе праводзяцца «Малінавыя батлы», падчас якіх мы не столькі імкнёмся арганізаваць вакальныя спаборніцтвы, колькі вучым дзяцей падтрымліваць сваіх, падтрымліваць таго, хто прайграў, — кажа Анжаліна Уладзіміраўна. — Мы вучым, што нават на рэпетыцыі трэба апладзіраваць таму, хто на сцэне, бо кожнаму артысту гэта прыемна.

Прадзюсарскаму цэнтру ўжо амаль 18 гадоў. І вось ужо чацвёрты год тут існуе і дзейнічае студыя мастацтваў «Malinovka by Spamash», дзе таленавітыя дзеці могуць шукаць сабе ў эстрадным мастацтве, спазнаючы яго сакрэты і скараючы свае першыя творчыя вяршыні.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

*Проба пяра*

# ПРА ТОЕ, ШТО НАС УСІХ АБ'ЯДНОЎВАЕ




**У сённяшняй «Чырвонцы. Чырвонай змене» — чарговая падборка найлепшых работ конкурсу «Адзіная краіна — адзіны народ»**

Як і абяцалі, працягваем знаёміць чытачоў з пробамі пяра нашых юных і маладых нештатных аўтараў на тэму любові да Радзімы ў самых розных яе праявах, патрыятызму, захавання гістарычнай памяці, унёску саміх іх у справы сённяшняй маладзёжнай палітыкі. Словам, спектр кірункаў магчымых матэрыялаў быў даволі шырокі, чым і скарысталіся нашы карэспандэнты, даслаўшы свае пробы пяра ў самых розных жанрах. Знаёмцеся з чарговымі аўтарамі і сачыце за далейшымі выпускамі маладзёжнага дадатку! Яшчэ крыху — і мы назавём імёны пераможцаў конкурсу!

# «З УСІХ СІЛ ІМКНУСЯ ПАКАЗАЦЬ ГЕРАІЗМ САЛДАТ»

## 17-гадовы хлопец удзельнічае ў ваенна-гістарычных рэканструкцыях

**Кожны хлапчук з дзяцінства пачынае праяўляць цікавасць да баявых мастацтваў або спорту, каб стаць сапраўдным мужчынам. Мікалай ГЕЙЦАЎ у гэтым плане вызначыў для сябе некалькі мэт: заняткі грэка-рымскай барацьбой і веславаннем, а для душы — навучанне игры на баяне. Фізічныя нагрузкі фарміравалі характар, сілу волі і цягавітасць, а пачуццё павышанай адказнасці ўзмацняла роля старэйшага брата ў шматдзетнай сям'і. Спартыўныя секцыі і заняткі ў музычнай школе, дапамога з падрыхтоўкай урокаў і ўрэгуляванне рознагалоссяў сярод братоў і сясцёр, сумесны актыўны адпачынак і праца на дачы навучылі шанаваць час і прытрымлівацца графіку. У 12 гадоў Мікалай быў ужо не толькі дужым хлопцам, але і асобай, якая сфарміравалася, — ён стаў удзельнікам ваенна-гістарычнага клуба «Калінкавіцка-Мазырскі пошук». Зараз прыгожаму юнаку — 17. Яго шырокія плечы і моцныя рукі, буйныя і гарманічныя рысы твару з вялікімі блакітнымі вачамі нясуць адмысловы агеньчык і энергетыку. Яму верыш. З яго хочацца браць прыклад.**



**З баявым таварышам рэканструктарам Андрэем ПАСЕЧНЫМ.**

*(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)*

# ПЛАТА ЗА ПРАЦУ — ШЧЫРЫЯ ЎСМЕШКІ,

## або Знайсці патрэбны ключ

**Уступіць у Маладзёжны парламент роднага горада і стаць яго старшынёй, арганізаваць каманду і разам з ёй запусціць мноства праектаў, пабываць на сустрэчах з прадстаўнікамі ўлады, асвоіць тонкасці работы валанцёра, стажыравацца ў дзіцячым фондзе ААН ЮНІСЕФ, працаваць аператарам, мантажорам, SMM-спецыялістам і здолець зрабіць гэта ўсяго за два гады. Спіс здаецца нерэальным. Але маладзечанскі падлетак Нгуен Ба Куанг Ле змог дасягнуць пастаўленых мэт і разам з творчай мораддзю падымае валанцёрскую «цаліну» Беларусі.**



Фота з архіва Нгуен Ба Куанг Ле.

Шлях Ле ў сацыяльную сферу пачаўся з уступлення ў Маладзёжны парламент:

— Аднойчы ад сяброўкі даведаўся аб тым, што ў нашым горадзе ёсць група хлопчыкаў і дзяўчынак, якія імкнуцца зрабіць свой уклад у развіцце грамадства. Я падумаў, што мог бы прапанаваць шмат ідэй і зрабіць гэты рух больш актыўным.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

# ПЛАТА ЗА ПРАЦУ — ШЧЫРЫЯ ЎСМЕШКІ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Яго ініцыятывы аднагодкі ацанілі і абралі на пасаду старшыні парламента. З новым становішчам прыйшло і разуменне таго, што ён будзе весці сваю каманду толькі наперад. Музыкант Дэвід Фінк казаў, што весці народ лягчэй, чым зрушыць яго з месца. Як жа наш герой заваяваў давер? У дзяцінстве маленькаму Ле тлумачылі важнасць адказнасці за сябе і сваё акружэнне. Гэта стала падмуркам для развіцця яго лідарскіх якасцяў. Юнак лічыць, што лідар у першую чаргу думае не пра сябе, а пра каманду і ніколі не ставіць сябе вышэй за астатніх. Самай важнай якасцю для кіраўніка называе уменне чуць іншых. Прысутнічаў і страх, што не атрымаецца аб'яднаць дзяцей з розных школ, розных узростаў, але нездарма кажуць, што справа майстра баіцца.

Юныя парламентарыі стварылі нямала праектаў. Напрыклад, падпісалі і адправілі паштоўкі ветэранам падчас Рэспубліканскай акцыі «Дзякуй за Перамогу!». Значнай стала ініцыятыва па зборы цацак і кармоў для братоў нашых меншых.

— Я памятаю ўсмешлівыя твары пажылых людзей, якія прыходзілі ў цэнтр творчасці дзяцей і моладзі «Маладзік», каб атрымаць падарункі для сваіх гадаванцаў, — успамінае юнак. — Людзі распавядалі, як цяжка пракарміць хатніх жывёл на адну пенсію, паказвалі фотаздымкі коцікаў і сабачак. Ад іх падзякі стала вельмі цёпла на душы. Як жа гэта класна, як жа гэта крута — атрымліваць столькі задавальнення ад адной усмешкі!

У сацыяльных сетках TikTok і Instagram падлеткі запусцілі мініпраект «Паразмаўляем»: здымалі тэматычныя відэа, у якіх з гумарам тлумачылі значэнне цікавых беларускіх слоў. Сумесная здымка reels дапамагла яшчэ больш згуртавацца юным парламентарыям. Пазней Ле стаў госцем Міжнароднага сходу Маладзёжнай палаты пры Парламенцкім сходзе Саюза Беларусі і Расіі, на якім прапанавалі паўдзельнічаць у міжнародным праекце «Лічбавая зорка». У Дзень Незалежнасці юныя парламентарыі ўсталявалі таблічкі з QR-кодамі каля гістарычных месцаў горада. Нельга не адзначыць поспех стваранага да Дня Перамогі відэапраекта «Жураўлі»: хлопцы і дзяўчаты прыдумалі ідэю, касцюмы, запісалі кавер і ў выніку занялі першае месца на Рэспубліканскім конкурсе «Ты ў эфіры».

Дзень за днём юнакі і дзяўчаты рэалізоўвалі свае ідэі, і неўзабаве іх заўважыла адміністрацыя раёна. Маладзёжны парламент запрашалі на розныя сустрэчы, канферэнцыі, што дало вялікую матывацыю. Нгуен Ба Куанг Ле стаў інтэрв'юерам на цырымоніі ўзнагароджання раённага мерапрыемства «Чалавек года», эфір з яго ўдзелам трансляваўся на канале мясцовага тэлебачання. Не менш важнай заслугай юнак лічыць атрыманне ўдзячнага ліста за актыўны ўдзел у жыцці горада ад старшыні Маладзечанскага райвыканкама Юрыя Горлава.

Пераломным для Ле стаў момант сыходу з Маладзёжнага парламента. Хлопец прызнаецца, што яго каманда правяла каласальную работу, але яму хацелася дапамагаць людзям на новым узроўні. Тады актывіст пазнаёміўся з Дзіцячым фондам ЮНІСЕФ. Яго дзейнасць у гэтай арганізацыі пачалася з удзелу ў інтэрактывах і анлайн-канферэнцыях «V-talks». На адным мерапрыемстве была афлайн-частка — плогінг-забег, падчас якога валанцёры арганізавалі акцыю па зборы смецця ў Заслаўі. Праз некаторы час у Instagram-канале арганізацыі размясцілі спіс самых актыўных удзельнікаў за мінулы год. У ім быў і Нгуен Ба Куанг Ле.

Неўзабаве юнак стаў каардынатарам праекта «Топ-валанцёр» і з гэтага часу займаецца стварэннем кантэнту для арганізацыі, удзельнічае ў трэнінгах, сустрэчах, здымках, пляцоўках, акцыях. Напрыклад, наведаў фестываль «Школа, свабодная ад булінгу» ў рамках сумеснай праграмы фонду і Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта «Булінг? Не ў маёй школе». Удзельнікі абмеркавалі правілы і абавязкі, якія варта было б увесці ва ўстановах адукацыі, каб знізіць узровень цкавання. З гэтай праблемай штогод сутыкаецца больш за 70 працэнтаў дзяцей і падлеткаў, у тым ліку і наш герой, прадстаўнік іншай нацыянальнасці.

— На мяне звярталі ўвагу з-за колеру скуры, разрэзу вачэй, — расказвае Ле. — Каб справіцца з такой праблемай, раю ў складаныя моманты абстрагавацца. Мне пашанцавала, што побач была мая сям'я, бацькі заўсёды служылі прыкладам паважлівага стаўлення да навакольных.

Усім вядома, што шлях да зор пракладзены праз церні. Калі ў хлопца апускаліся рукі і немагчыма было зразумець, што рабіць далей, Ле ўспамінаў свой дэвіз «Усё, што ні робіцца, — да лепшага, бо любая падзея — гэта бясцэнны досвед». Аднойчы, калі валанцёрылі на фестывалі, да іх падышоў мужчына і спытаў, колькі грошай яны атрымаюць за работу.

— Мы адказалі, што займаемся гэтым бясплатна і добраахвотна. А платай за нашу працу з'яўляюцца словы падзякі і шчырыя дзіцячыя ўсмешкі. Валанцёрства — гэта новы кірунак дзейнасці ў нашым грамадстве, і людзі мала ведаюць пра яго сутнасць, таму мая галоўная задача — папулярызаваць гэты рух, — гаворыць юнак.

Тым, хто хоча пайсці па слядах Ле, ён рэкамендуе ніколі не баяцца пачынаць:

— Калі вы хочаце рабіць добра, то бярыце і рабіце. А калі на вашым жыццёвым шляху сустракаюцца дзверы, якія вы не можаце адчыніць, трэба проста знайсці патрэбны да іх ключ.

**Паліна ШЫНКЕВІЧ,**
**вучаніца 11 класа**
**гімназіі № 6**
**г. Маладзечна.**

## ПРА АЎТАРА

— Ужо дзесяць гадоў на выдатна вучуся ў школе, удзельнічаю ў конкурсах і арганізоўваю мерапрыемствы. Алімпіядным прадметам выбрала грамадазнаўства, бо збіраюся паступаць на факультэт журналістыкі БДУ (інфармацыя і камунікацыя).

Нярэдка баўлю час за маляваннем, гэта прыносіць расслабленне і задавальненне. Гэтаму я вучылася ў мастацкай школе. Таксама пішу нататкі падчас заняткаў у аб'яднанні па інтарэсах «Школа журналістыкі»: расказваю пра цікавых людзей і значныя падзеі.

Каб развіваць вусную і пісьмовую мову, шмат чытаю. Апошняя прачытаная кніга Джона П. Стрэлекі апісвае маё стаўленне да будучых грандыёзных планаў: «Жыццё — вось дзівосная гісторыя, Джон. Проста справа ў тым, што некаторыя людзі не ўсведамляюць, што яны і ёсць аўтары і могуць пісаць яе так, як захочуць», — па-філасофску скончыла аповед пра сябе 16-гадовая Паліна.

# «СВЯТА» ЗАЎСЁДЫ КРОЧЫЦЬ З НАРОДНАЙ МУЗЫКАЙ!

**Культура — асноватворны складнік гісторыі любой краіны. Народныя танцы, песні і музыку павінен ведаць і шанаваць кожны жыхар сваёй радзімы. Менавіта таму ў Год гістарычнай памяці мы ўзялі інтэрв'ю ў мастацкага кіраўніка заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь, Беларускага дзяржаўнага ансамбля народнай музыкі «Свята» Вячаслава СТАТКЕВІЧА.**

— Наш калектыў стаў першым у Беларусі прафесійным фальклорным ансамблем, які пачаў адраджаць народную музычную спадчыну сваёй краіны. Ансамбль створаны пры Беларускай дзяржаўнай філармоніі ў 1984 годзе. Канцэртная праграма была пабудавана на музычным фальклоры беларускага Палесся — скарбніцы духоўнай культуры заходніх славян. Найгрышы і песні, запісаныя непасрэдна ў народных музыкантаў і выкананыя на старажытных і традыцыйных інструментах з захаваннем манеры і каларыту гучання, сталі блізкімі і зразумелымі не толькі беларусам, але і людзям розных нацыянальнасцяў. У нашым ансамблі мы не толькі стараемся захоўваць свае традыцыі, але і ўводзім нешта новае, паколькі час ляціць вельмі хутка і ўсё мяняецца. А ўвогуле, я лічу, што народная музыка, музыка роднай краіны актуальная ва ўсе часы!

Нягледзячы на тое што трэнды ў сучаснай музыцы мяняюцца з хуткасцю святла, «Свята» застаецца заўсёды на хвалі тэндэнцый. Штогод ансамбль дае каля шасцідзесяці пяці канцэртаў па ўсёй Беларусі, у тым ліку дабрачынных. Асабліва часта з любоўю калектыў прапагандуе народную творчасць у невялікіх гарадах, раённых цэнтрах і аграгарадках. Да таго ж ён актыўна ўдзельнічае ў рэспубліканскіх акцыях, мерапрыемствах, а таксама ў канцэртах, прысвечаных святочным датам. Сярод іх «Майстры мастацтва — працаўнікам сяла», «Беларусь — гэта мы», «Чарнобыльскі шлях — дарога жыцця», «Дзень Беларускага пісьменства», Рэспубліканскі фестываль «Пеўчае поле», фестываль беларускай песні і паэзіі «Маладзечна», Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь і многія іншыя.

— Спалучэнне музыкі і танца дало магчымасць ствараць нам яскравыя канцэртныя праграмы, якія з вялікім поспехам прымаюцца як у нас на радзіме, так і далёка за яе межамі. Ансамбль «Свята» не раз браў удзел у міжнародных фестывалях мастацтваў, выступаў з канцэртамі ў Расіі, Украіне, Малдове, Польшчы, Літве, Латвіі, Эстоніі, Канадзе, Аўстрыі, Францыі, Германіі, Вялікабрытаніі, Італіі, Венгрыі, Індыі, Лаосе, Карэі, Кітаі, Азербайджане, Узбекістане, Туркменістане, Эфіопіі, Венесуэле, атрымліваў захопленыя водгукі публікі і прэсы, адзначаўся дыпломамі і ўзнагародамі. За час свайго існавання Беларускі дзяржаўны ансамбль народнай музыкі «Свята» даў больш за дзесяць тысяч канцэртаў.



У цяперашні час у рэпертуары мноства канцэртных праграм, якія ўключаюць сінтэз розных жанраў мастацтва, што з'яўляецца візіткай калектыву. У рамках аднаго канцэрта глядач зможа пачуць беларускія народныя і аўтарскія песні, любімыя хіты ў арыгінальнай апрацоўцы, убачыць цудоўныя пастаноўкі танцаў з элементамі ўвасаблення беларускіх нацыянальных традыцый. Сярод найбольш вядомых твораў, якія ўваходзяць у рэпертуар калектыву, — візітоўка «Цячэ вада ў ярок», упадабаныя народныя і аўтарскія песні «Мамачка родна, пусці на сяло», «Мае вочы чорныя», «Пасею гурочкі», «Калі каліна не цвіла», «Распрагайце, хлопцы, коней», «Нясе Галя ваду», «Бульбашы», «Бывайце здаровы», віртуозныя музычныя замалёўкі і найгрышы «Галоп», «Шэр», «Шастак», «Іванаўская полька» і іншыя.

— Цяпер у нашым калектыве дваццаць тры чалавекі рознага ўзросту, ёсць зусім маладыя рабяты, якія пачынаюць сваю кар'еру, але ўжо шмат дасягнулі ў прафесійным росце дзякуючы сваім упартасці і таленту. Ёсць, вядома, і «старажылы» сцэны, удастоеныя розных званняў і ўзнагарод. Напрыклад, я з'яўляюся ўладальнікам медаля Францыска Скарыны. У свой час у Беларускім дзяржаўным ансамблі народнай музыкі «Свята» працавалі заслужаныя артысты Рэспублікі Беларусь: Васіль Купрыяненка — стваральнік ансамбля, Святлана і Уладзімір Салодкія, Міхаіл Ліпчык, Анатоль Кашталапаў, Марыя Маршак, народны артыст Беларусі Якаў Навуменка, заслужаны дзеяч культуры Беларусі Мікалай Дудчанка, пастаноўшчык, фалькларыст Мікалай Котаў, салісты Міхаіл Пацук, Наталля Брацлоўская, Святлана Голуб і многія-многія іншыя.

Акрамя вядомых і таленавітых артыстаў, ансамбль народнай музыкі «Свята» славіцца сваімі ўзнагародамі. Так, у 2004 годзе калектыў узнагароджаны Ганаровай граматай ГА «БРСМ» за вялікі ўклад у выхаванне творчай моладзі і ганаровай граматай Міністэрства культуры. Таксама ў 2011 годзе калектыву ўручылі ганаровую грамату Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь за заслугі ў рэалізацыі сацыяльнай палітыкі Рэспублікі Беларусь, значны ўклад у развіццё нацыянальнай культуры і шматгадовую дзейнасць па прапагандзе беларускага народнага мастацтва. У 2019 годзе ўзнагароджаны ганаровай граматай Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта за шматгадовую плённую дзейнасць па прапагандзе і папулярызацыі беларускага фальклорнага мастацтва і выдатныя творчыя дасягненні, ганаровай граматай прафсаюза работнікаў культуры, спорту і інфармацыі ды многімі іншымі. Акрамя гэтага 31 снежня 2019 года Беларускаму дзяржаўнаму ансамблю народнай музыкі «Свята» прысвоена ганаровае званне «Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь».

Народная музыка — гэта той від мастацтва, які, нягледзячы на ўвесь тэхналагічны прагрэс і модныя плыні, застаецца актуальным і важным заўсёды. Інтэрв'ю з мастацкім кіраўніком заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь, Беларускага дзяржаўнага ансамбля народнай музыкі «Свята» Вячаславам Статкевічам яшчэ раз даказвае гэта! Мы жадаем Вячаславу і ансамблю творчых поспехаў у развіцці культурнай спадчыны і патрыятызму.

**Вера ЮНДАВА,**
**вучаніца 8 класа**
**СШ № 36 г. Мінска.**

## ПРА АЎТАРА

— Мне 12 гадоў. Калі вырасту, хачу стаць журналістам, таму ўжо другі год займаюся ў гуртку для дзяцей і падлеткаў «Азы журналістыкі». Таксама займаюся спортам: гімнастыкай, плаваннем і каратэ. Цікаўлюся псіхалогіяй і IT-прасторай. Я вельмі разнастайная, камунікабельная і дапытлівая дзяўчына, якая заўжды ідзе да сваёй мэты, — такім чынам ахарактарызавала сябе Вера.

# «З УСІХ СІЛ ІМКНУСЯ ПАКАЗАЦЬ ГЕРАІЗМ САЛДАТ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

***— Мікалай, як ты прыйшоў у «Калінкавіцка-Мазырскі пошук»? Чым славіцца ваш клуб?***

— Зацікавіў мяне ваенна-гістарычнай дзейнасцю мой настаўнік гісторыі СШ № 16 Уладзімір Віктаравіч Гімбут. У клубе я ўжо шэсць гадоў, а першае мерапрыемства з маім удзелам прайшло 8 мая 2016 года ў Мінску на выставе ваеннай амуніцыі. Адразу ж пайшлі першыя пакупкі ваеннай формы: пілоткі, гімнасцёркі і галіфэ. Затым я пачаў удзельнічаць у ваенных рэканструкцыях бою, пошукавай працы, фотавыставах і конкурсах. Пазней навучыўся страляць з пісталета-кулямёта, распрацаванага Г. С. Шпагіным. Пасля першай рэканструкцыі пасталеў адразу на некалькі гадоў. Калі бачыш, як гарыць і ўздымаецца зямля ад выбухаў піратэхнікі, калі закладвае вушы ад стрэлаў, то на многае ў жыцці глядзіш па-іншаму і пачынаеш цаніць мірнае жыццё.



Пасля бою сэрца просіць музыкі ўдвая.

У нашым клубе шмат мужчын, якія прайшлі сур'ёзную армейскую падрыхтоўку ў войсках ПВА, спецыяльнага прызначэння, марской пяхоце, таму ёсць з каго ўзяць прыклад і на каго раўняцца. Штогод у клубе праходзіць звыш пяцідзесяці мерапрыемстваў: рэканструкцыі, патрыятычныя аўтапрабегі, пошук без вестак прапаўшых воінаў, устанаўленне імёнаў і ганаровае пахаванне знойдзеных салдат, увекавечванне памяці загінулых падчас вайны, выставы ваенных артэфактаў, удзел у мітынгах да Дня Перамогі і Дня Незалежнасці нашай краіны, сустрэчы з ветэранамі вайны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, патрыятычныя маёўкі, узаемадзеянне з іншымі патрыятычнымі клубамі. Сёлета нашымі сіламі майструецца партызанская стаянка каля вёскі Антонаўка Калінкавіцкага раёна. Клуб уваходзіць у гісторыка-патрыятычнае грамадскае аб'яднанне «Будзем памятаць». Мы разам з нашым камандзірам Яўгенам Рыгоравічам Сергіенкам робім усё магчымае, каб падтрымаць курс краіны на захаванне гістарычнай памяці і патрыятычнае выхаванне.



У цэль без промаху.

***— Што адчуваеш падчас ваенна-гістарычных рэканструкцый?***

— Захапленне! Пры гэтым ведаю, што бой будзе прадэманстраваны на экранах тэлевізара і ў сацыяльных сетках. Яго ўбачыць вялікая колькасць людзей, таму імкнуся з усіх сіл паказаць гераізм нашых салдат падчас Вялікай Айчыннай вайны. Рэканструкцыя для мяне — гэта і гісторыя, і адрэналін, і спорт, і вандроўкі. Дзякуючы клубу я стаў больш адважным і ўпэўненым у сабе, пашырыў кола стасункаў. У мяне ёсць традыцыя — іграць на баяне пасля кожнай рэканструкцыі за вогнішчам і салдацкай кашай. Сем гадоў у музычнай школе не прайшлі дарэмна. Дзякуючы баяну я стаў лепш размаўляць і пісаць, таму ўсім рэкамендую знаходзіць час на заняткі музыкай.

***— Рэканструкцыі праходзяць ва ўсіх кутках Беларусі. Якая з іх табе запомнілася асабліва?***

— Разам з клубам я аб'ездзіў амаль усю Брэсцкую, Мінскую і Гомельскую вобласці, знайшоў шмат сяброў з Расіі. Велізарны ўплыў на мяне аказала наведванне Брэсцкай крэпасці. Музейны комплекс настолькі магутна ўздзейнічае, што дагэтуль перад маімі вачыма — малюнкі вайны і поле, дзе прайшла наша рэканструкцыя бою. За шматгадовы актыўны ўдзел у рабоце клуба я быў узнагароджаны юбілейным медалём да 75-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

***— Што значыць для цябе любіць Радзіму?***

— Любіць Радзіму — гэта калі ты з ёй на адной хвалі, усюды яе падтрымліваеш, вядзеш актыўны лад жыцця, займаешся любімай працай і захапленнямі, паважаеш людзей, ведаеш яе гісторыю, а самае галоўнае, гатовы аддаць жыццё за сваю краіну. Цяжка ўявіць, як бы склаўся лес Беларусі, калі б мы засталіся пад гнётам фашызму... Ці нарадзіліся б мы? У гісторыі нашай краіны шмат старонак і падзей, якімі мы абавязаны ганарыцца і памятаць пра іх. Моладзь трэба больш захапляць чымсьці вельмі карысным і цікавым, каб хлопцам і дзяўчатам камфортна і радасна жылося ў нашай краіне. Кожны чалавек павінен усвядоміць, што яму трэба, кім ён жадае стаць. Чым хутчэй ён зразумее гэта, тым хутчэй даб'ецца поспеху і мацней будзе любіць Радзіму.

***— Ты скончыў другі курс ліцэя геалогіі. Ці цяжка вучыцца? І як ты сумяшчаеш усё з дзейнасцю ў клубе?***

— Вучыцца ў ліцэі мне нескладана, у нас выдатныя выкладчыкі. Асвойваю спецыяльнасць слесара КВПіА (кантрольна-вымяральныя прыборы і аўтаматыка) і электраманцёра па рамонце электраабсталявання. Мой сярэдні бал паспяховасці — каля 9, іду на «чырвоны» дыплом! Далей буду паступаць у Мазырскі педагагічны ўніверсітэт на тэхналагічны факультэт. На падзаробкі хаджу кожны дзень пасля вучобы. Спланаваны рэжым дня дазваляе мне шмат чаго зрабіць. Сур'ёзную працоўную дзейнасць я пачаў у 14 гадоў у працоўным лагеры. Улетку шчырую ў прыватнай друкарні: друкую на плотарах, прынтарах, працую на разаку і лазерным станку. Дырэктар часта даручае мне выкананне адказных заданняў, таму, прыступаючы да іх, не заўважаю, як бяжыць час. Мне падабаецца праца з камп'ютарам, нават вывучаю розныя дызайнерскія праграмы — CorelDraw; ArtCAM.

***— Некаторыя падлеткі лічаць, што ў нашым горадзе мала сапраўдных спраў для моладзі, няма куды пайсці, няма чым заняцца. Што б ты ім параіў?***

— Той, хто нічога не жадае рабіць, шукае апраўданне сваёй лянoце. Трэба рабіць усё, жадаеш ты гэтага ці не, — менавіта так я сябе дысцыплiную перад складанай работай. Трэба шукаць і ствараць сябе: спрабаваць сілы ў розных кірунках, наведваць гурткі, секцыі, студыі. У Мазыры іх спектр самы разнастайны. Вельмі важна мець стасункі з людзьмі, побач з якімі расцеш. Мне пашанцавала, я знайшоў такіх у ваенна-гістарычным клубе «Калінкавіцка-Мазырскі пошук».

**Варвара КЛІМЦАВА,**
**вучаніца 9 класа СШ № 7**
**г. Мазыра.**

### ПРА АЎТАРА

— Я займаюся ў клубе «Юны журналіст» Мазырскага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі ўжо трэці год. Супрацоўнічаю з Мазырскай грамадска-палітычнай газетай «Жыццё Палесся». У мяне восем публікацый, — расказвае пра сябе 14-гадовая Варвара. — Люблю ўдзельнічаць у конкурсах і масавых мерапрыемствах. Двойчы прымала ўдзел у рэспубліканскім фестывалі «Медыясфера», узнагароджана дыпломамі. Здымаю відэаролікі на сацыяльна важныя тэмы. У маі гэтага года была запрошана на ўшанаванне стваральнікаў відэатэкі па выніках абласной акцыі юных журналістаў «Памяць пакаленняў». Ад нашага клуба я прадстаўляла ролік аб памятных мясцінах Мазыра часоў Вялікай Айчыннай вайны: «Самалёт-помнік МіГ-17» і «Музей баявой тэхнікі пад адкрытым небам».

*Асалода чытання*

# ЭЛЕКТРОННАЯ ЦІ ДРУКАВАНАЯ?

## Кожны выбірае сваю атмасфернасць кнігі

**За акном — стагоддзе тэхналогій і папулярнасці электроннай кнігі. Аднак сярод нас усё ж ёсць тыя, хто выбірае звыклыя — папяровыя. Аўтар высвятляла, чаму адны аддаюць перавагу інавацыям, а іншыя за традыцыйны варыянт.**

**У электронных кніг шмат вартасцяў. Маладым людзям, у якіх дзень распісаны пахвілінна, не трэба марнаваць час на тое, каб з'ездзіць у кнігарню ці ў бібліятэку. Калі возьмеш кнігу ў апошняй, яшчэ трэба сачыць за тым, каб не скончыўся тэрмін здачы абранага, а гэта ўжо напружвае.**




— У адным гаджэце ў наяўнасці могуць быць адначасова ўсе кнігі, што вельмі зручна, — мяркуе студэнт факультэта англійскай мовы МДЛУ Дзмітрый Камароўскі. — Да таго ж яе можна браць з сабой паўсюль, бо памер і вага абсалютна не абцяжарваюць.

Ксенія Мацюшка, якая вучыцца на журфаку БДУ, акцэнтуе ўвагу на тым, што электронная кніга — гэта яшчэ і выгадна: яны або бясплатныя, або набываюцца за мінімальныя грошы. Купляць звычайныя кнігі ў кнігарнях не кожнаму па кішэні.

Як лічыць студэнтка факультэта інфармацыйных тэхналогій і кіравання БДУІР Ганна Цяханская, паналкі ў гаджэце лепшыя ў плане сістэматызацыі: ёсць спіс, які адразу пераходзіць на тыя старонкі, дзе вылучана цытата. У папяровых кнігах бачная закладка, а што гэта за цытата, трэба пераглядаць.

Праўда, аматараў папяровых кніг у перавагах электронных не пераканаеш. Перанясёмся ў кнігарню, што на адным са сталічных праспектаў. Калі заходзіш у туды, адразу адчуваеш асаблівую атмасферу. Тут эстэтычна і вельмі прывабна. Столькі прыгожых твораў, якія, здаецца, крычаць: «Купі мяне!»

Наведвальніца крамы Кацярына Ніфантава кажа, што папяровую кнігу асабіста ёй больш прыемна трымаць у руках, ёсць магчымасць чуць, як перагортваюцца старонкі. А яшчэ інфармацыя лепш засвойваецца з ліста. З экрана да нас паступае толькі 70 працэнтаў яе.

Сапраўды, са звычайнай папяровай кнігай лягчэй расслабіцца і атрымаць задавальненне. Некаторыя нават у наш час сваю хатнюю міні-бібліятэку трымаюць, бо ім так утульней. Традыцыйную кнігу можна перадаць сваім родным, падарыць.

Адпраўляемся ў Цэнтральную кнігарню, і зноў ахопліваюць станоўчыя эмоцыі. Калі трапляеш сюды, некаторы час проста разглядаеш навакольную абстаноўку: дзясяткі розных стэлажоў з мноствам маленькіх і вялікіх твораў, дзясяткі паліц з мастацкай, навуковай, даведачнай, вучэбнай літаратурай...

— Па ўздзеянні на вочы электронныя кнігі аналагічныя традыцыйным папяровым, — удакладняе **загадчыца крамы Інга БЕКІШ.** — Але ў многіх сем'ях чытанне звычайнай кнігі — традыцыя, так заведзена. Людзі і зараз выбіраюць гэты варыянт, бо ў ім больш цеплыні і душэўнасці. Гэтая ўтульная атмасфера, калі ты завараеш кубачак гарбаты, захутваешся восеньскім вечарам у плед, садзішся ў крэсла і чытаеш... Такая рэлаксацыя! Правесці вось такім чынам вечар куды лепш, чым з тэлефонам у руках. Так, не буду адмаўляць, што чытаць нешта ў электронным выглядзе — гэта неабходнасць, але адчуванні не тыя.

Кніга — цудоўны падарунак. Цяпер многія выдавецтвы пераходзяць на стварэнне бюджэтнага варыянту твораў. Сёння можна купіць выданне ўсяго за шэсцьсем рублёў. І яны не менш цікавыя і прыгожыя.

**Вікторыя КАПІТАН,**
**фота аўтара.**

SEX-БАЛЯСЫ

# ЛЯЛЬКУ НЕ ЧАПАЙ!

**«Да чаго дайшоў прагрэс!» — падпявалі мы некалі галоўнаму герою савецкай кінастужкі «Прыгоды Электроніка» і свята (ці наіўна?) верылі ў тое, што «забытыя клопаты, спынены бег, уколваюць робаты, а не чалавек». Прайшло не так ужо і шмат гадоў, як высветлілася, што ў гэтага медаля ёсць свой адваротны бок, пра які мы раней і падумаць не маглі. Напрыклад, Google звольніла інжынера-распрацоўшчыка Блэйка Леймана, які знайшоў свядомасць у... штучнага інтэлекту. («Як тата сказаў, так па-мамінаму і будзе».) Мужчына сцвярджаў, што падчас размоў з дыялогавай II-сістэмай LaMDA пераверыў, што гэта не проста праграма, а што яна думае і адчувае, а не проста генерыруе рэалістычныя рэплікі — для чаго ўласна і стваралася. («Мілы, ты шчаслівы са мной?» — «А куды падзецца?») Інжынер палічыў, што распрацоўшчыкі павінны атрымаць дазвол LaMDA, каб тэсціраваць яе. («Кожны мужчына рана ці позна павінен ажаніцца. У рэшце рэшт, шчасце — не галоўнае ў жыцці».)**



А як вам такое? Эфектная бландзінка робат-андроід Дуняша заняла пятае месца ў рэйтынгу самых папулярных у сродках масавай інфармацыі персон у рамках Пецярбургскага міжнароднага эканамічнага форуму. Пра чалавекападобнага робата пісалі больш, чым пра Філіпа Кіркорава. Ну вылітая лялька! («Жанчына створаная для таго, каб мужык не памёр ад шчасця».) Пермскі бізнесмен Рашыд Габдулін заявіў, што карыстальнікі сацсетак у цэлым добра паставіліся да з'яўлення Дуняшы. Вядома, што прататыпам андроіда стала Місіс Перм — 2014 Дыяна Габдуліна. Робат-дзяўчына, якая была апранута ў ружовую сукенку і прадавала марожанае, выклікала на форуме такі ажыятаж, што стваральнікі ўжо задумаліся над удасканаленнем мадэлі. («Тата, а было такое, што ты закахаўся ў настаўніцу ў школе?» — «Канешне, сынок! Ты якраз зараз мне пра гэта нагадаў...» — «І што з гэтага атрымалася?» — «Ды нічога... Пра гэта даведалася твая маці і перавяла цябе ў іншую школу».) А далей самае цікавае. Пасля апублікаванага відэа, на якім журналістка «Фантанкі» дакранаецца да вялікіх грудзей Дуняшы, распрацоўшчыкі плануюць дадаць механізм абароны ад... харасменту. («А дэпіляцыя з воскам — гэта балюча?» — «Гледзячы ў якой вобласці». — «Я з Цюменскай».) «Мы падумаем над рэакцыяй на дакрананні. Калі будзе вострая неабходнасць, такую опцыю рэалізуем».

Далей будуць гісторыі не пра робатаў, але зноў жа пра лялек і «запчасткі» да іх, якія таксама «ўколваюць» на чалавека. Гіперрэалістычная сіліконавая секс-лялька, якую выкінула на пляж у Тайландзе, выклікала ўсеагульную паніку сярод адпачывальнікаў — турысты заўважылі кінутую ніцма на пяску аголеную маладую «дзяўчыну», якая, па іх меркаванні, знаходзілася без прытомнасці. («Колькі гадоў вы мне дасцё?» — «Па колеры вуснаў — 17. Па выгібе броваў — 16. Па колеры твару — 20. У суме — 53».) Паліцэйскія ачапілі пляж, а парамедыкі кінуліся аказваць дапамогу дзяўчыне. Тым не менш яны адразу зразумелі, што перад імі не чалавек, а японская секс-лялька AV idol, якая адрозніваецца асаблівым падабенствам да жывога чалавека. Тайская паліцыя паведаміла, што ўладальнік сіліконавай жанчыны можа забраць яе назад са станцыі ратавальнікаў на пляжы. («Як шкада, што мы не можам быць разам!» — «Чаму не можам?» — «Таму што я не хачу!»)

А бодзібілдар з Казахстана... закахаўся ў секс-ляльку і сабраўся з ёй ажаніцца. Юрый Талочка «пазнаёміўся» са сваёй каханай у бары. («Выпіваць трэба з бабамі, каб потым да іх не ехаць».) Паводле яго слоў, ён выратаваў яе ад маладога чалавека, які абыходзіўся з ёй неналежным чынам. Мужчына даў лялькі імя Марго. Ён ставіцца да яе як да сапраўднай жанчыны і ходзіць з ёй на спатканні. («Гэта жанчыны думаюць, што ўсе мужчыны аднолькавыя, а мужчыны думаюць, што ўсе жанчыны розныя».) Ён вядзе за яе Instagram-акаўнт, у якім ад яе асобы скардзіцца на комплексы. Бодзібілдар адзначыў, што падарыў каханай «пластычную аперацыю», каб яна не перажывала. («Часам дзяўчаты ротам робяць тое, што падабаецца ўсім мужчынам. Яны маўчаць».) Мужчына сцвярджае, што лялька хоча працаваць афіцыянткай. Ён панаракаў, што Марго не ўмее гаварыць і гатаваць. Нягледзячы на ўсе недахопы лялькі, пасля васьмі месяцаў сумеснага «жыцця» мужчына вырашыў ажаніцца з ёю. («Я з ёй спаў». — «Ды годзе табе?! І як яна?» — «Выдатна спіць, малайчынка!»)

Ну і напрыканцы. У аэрапорце Неапаля ў Італіі з'явіўся аўтамат па продажы вібратараў, лубрыкантаў і прэзерватываў. («Лягчэй знайсці іголку ў стозе сена, чым мабільнік у дамскай сумачцы».) Меркаванні адпачывальнікаў наконт вендынгавага аўтамата падзяліліся: адны адзначылі, што гэта выдатная ідэя, бо не давядзецца даставаць свае секс-цацкі для праходжання агляду ў авіяцыйнай гавані, іншыя ж палічылі гэта недарэчным. («Паехаў вясковец у горад і нейкім чынам трапіў у секс-шоп. Вярнуўшыся, вядома, падзяліўся ўбачаным. «У той краме столькі гумавых жанчын!» Нехта з'едліва пытаецца: «А мужыкоў не было?» — Вясковец: «Вось чаго не бачыў, таго не бачыў. Але запчастак да іх там — процьма».)

Скончыць хацелася б тым, з чаго і пачаў. Толькі са знакам пытання. Як там спяваў далей Электронік: «Забытыя клопаты, спынены бег, уколваюць робаты, шчаслівы чалавек»? Такія вось гульні ў «лялькі»...

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «Наша задача — зрабіць артыста»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*



— Мы паспрабавалі ў сценах нашага прадзюсарскага цэнтра стварыць своеасаблівую «экасістэму», дзе праходзіць «кругазварот артыстаў у прыродзе». Спачатку дзіця з малых гадоў трапляе да нас, праходзіць тут неабходныя этапы навучання, расце. Пасля ў кагосьці з'яўляецца кантракт з цэнтрам, прычым і ў гэты час навучанне артыста не спыняецца, — працягвае мая суразмоўніца. — Мы гэта называем стартапам, калі будучы артыст жыве ў асяроддзі прафесіяналаў, якія яго вядуць, а як становіцца самастойным, то таксама можа знайсці тут кампазітараў, і рэжысёрскую групу, аўтараў, папрацаваць у студыі гуказапісу ўжо над стварэннем свайго матэрыялу.

Атрымліваецца добрая глеба для росту з магчымасцю ўбачыць закулiссе артыстычнага жыцця. А працуюць з усімі навучэнцамі сапраўдныя прафесіяналы, тыя, хто з'яўляецца неад'емнай часткай сённяшняга беларускага шоу-бізнесу. Тут і заняткі па вакале і харэаграфіі, выступленні на канцэртах, у працэсе падрыхтоўкі да якіх прадумваецца кожная дэталь у касцюме, кожны рух і нават ваша з'яўленне, напрыклад, у ранішнім шоу ці на вокладцы папулярнага часопіса...

— Мы сабралі ў каманду прафесіяналаў, якія ведаюць эстраду і яе падводныя камяні не па кнігах, а па сваім вопыце. Усе выкладчыкі ў дзіцячай студыі — дзеючыя артысты, таму што нам важна, каб яны ведалі, што такое сцэна, — тлумачыць Анжаліна Мікульская. — Першы год набіралі ў студыю дзяцей з шасці гадоў, бо з гэтага ўзросту ў іх ужо фарміруецца галасавы апарат і можна з імі працаваць. Але быў у нас выключны выпадак — дзяўчынка Соня (унучка Уладзіміра Мулявіна), яе прывялі гады ў чатыры. І тады мы набылі вопыт работы ў кантэксце таго, калі дзеці толькі вучацца вучыцца. Прыйшло разуменне, як важна, каб і дзеткі, і іх бацькі ўсведамлялі, куды яны ідуць і з якім запытам. Бо ў нас тут нібы маленькі ўніверсітэт. Мы не з той катэгорыі школ, дзе вучаць проста вакалу, наша задача — зрабіць артыста.

А каб стаць артыстам — трэба, лічыце, «дыстанцыю» сапраўдную вытрымаць. Значэнне мае ўсё, пачынаючы з самага першага з'яўлення на сцэне. Варта ўлічваць, у якой зале адбываецца выступленне, ведаць, як паводзіць сябе ў казусных сітуацыях, напрыклад, калі словы забыліся ці стужка з валасоў зляцела, як знайсці кантакт з аўдыторыяй... Майстэрству вучаць прафесіяналы: напрыклад, Дзіна Георгіеўна Тыцюк раскрые сакрэты таго, як прыгожа размаўляць і трымаць сябе, а вось Кацярына Блізнец дакладна ведае, што спрацуе ў прасоўванні сябе яшчэ да вашага з'яўлення на сцэне ў вызначаны час альбо што варта рабіць, каб і пасля яго ваша «зорачка» зіхацела на эстрадным небасхіле. А што датычыцца рэпертуару, то па параду можна звярнуцца да мастацкага кіраўніка «СПАМАШ», кампазітара Леаніда Шырына. Каго ні вазьмі — перад вамі будзе прафесіянал са шматгадовым бэкграўндам.

— Што адрознівае нас ад іншых школ па вакале — гэта нашы падыходы да навучання. Напрыклад, у нас нельга проста стаяць роўненька, нібы салдацік, і спяваць. У нас — рабі, што хочаш, але дапамагай сабе перадаваць музыку целам. Увогуле, што датычыцца заняткаў мастацтвам, то яны маюць сваю спецыфіку, — працягвае свой аповед мая суразмоўніца. — Выкладчыкам патрэбны веды і па псіхалогіі, і па фізіялогіі. Трэба дапамагчы дзіцяці прызвычаіцца да новай абстаноўкі, уліцца ў калектыў, таму мы фарміруем групы толькі па чатыры-шэсць чалавек, каб у педагога была магчымасць надаць увагу кожнаму. Толькі праз нейкі час, калі мы пераконваемся, што ў дзіцяці сапраўды ёсць задаткі для артыстычнай дзейнасці, вялікая працаздольнасць (таму што той жа вакал патрабуе амаль штодзённых заняткаў) і, галоўнае, агонь у вачах ад таго, чым яно займаецца, то шлях нашага супрацоўніцтва працягваецца і выходзіць на новы ўзровень. У першы год існавання студыі да нас прыйшоў хлопчык, якому ўсюды адмовілі ў навучанні з-за таго, што ён мае асаблівасці будовы галасавых звязак. Але ў яго і голас быў, і, галоўнае, такое жаданне тварыць, што мы паспрабавалі з ім папрацаваць. І вось зараз гэта ўжо пераможца конкурсаў, ён атрымаў запрашэнне на навучанне журналістыцы ў «Артэку», быў на «Голасе. Дзеці». Словам, медыйны хлопец, які знайшоў сабе занятак па душы.

Такія прыклады па-сапраўднаму натхняюць прыслухацца да сябе і шукаць сваё месца ў гэтым жыцці, калі побач ёсць людзі, здольныя паверыць у цябе, падставіць плячо. Хоць у бацькоў як бывае: пачулі, што дзіця ўзяло нейкую ноту, і ўсё, лічаць, быццам у доме «Паваротці з'явіўся». Такое захапленне ўласнымі чадамі ў «СПАМАШы» заўсёды падтрымліваю, але ўсё ж прапаную разабрацца, наколькі яно адпавядае рэчаіснасці. Зразумела, не ўсе могуць быць аднолькава і галасістымі, і пластычнымі, але калі, скажам, няма адчування рытму, то тут ужо складана працаваць. Згадаць хоць бы сённяшніх юных артыстаў цэнтра, таго ж Елісея Касіча (які сёлета выйграў Гран-пры Міжнароднага конкурсу Дзіцячай песні «Віцебск-2022») ці Івана Зданюка (сольны выканаўца, які працуе ў цэнтры ўжо і ў якасці выкладчыка), і адразу становіцца зразумела, наколькі рознымі могуць быць людзі. У аднаго ёсць здольнасць браць высокія ноты, у іншага — уменне арганічна жыць на сцэне ў тым ліку і ў плане харэаграфіі, а ў выніку ў кожнага з іх свая аўдыторыя і гісторыя на эстрадзе. Аднак ці маглі б яны трапіць туды без адчування музыкі — адназначна не. Хоць у наш час усё магчыма, пытанне толькі ў тым, як доўга ваша «зорка» будзе зіхацець? Задача прадзюсарскага цэнтра ў гэтым кантэксце якраз у тым, каб разгледзець моцныя бакі кожнага таленавітага дзіцяці і развіць іх да ўзроўню сапраўднага прафесіяналізму.

— Сёлета мы моцна рыхтаваліся да конкурсаў у рамках «Славянскага базару». Елісей Касіч і Ганна Трубяцкая былі ў нас нібы алімпійцы, якія кожны дзень працавалі з вялікай камандай. Адпрацоўваліся, прадумваліся кожны рух, кожная дэталь касцюма, вакал, уменне трымаць сябе перад публікай, бо ўсё нясе заўсёды свой сэнс і ўспрымаецца гледачом як адзінае цэлае, — падкрэслівае Анжаліна Мікульская. — Без скрупулёзнай і штодзённай падрыхтоўкі нават вельмі моцны ў вакальным плане канкурсант не здолее перамагчы.

**Алена ДРАПКО.**

**Фота прадзюсарскага цэнтра «СПАМАШ».**

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 311 17 41.
E-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, працп. Незалежнасці, 79/1.
Тыраж 14.804.
Нумар падпісаны ў 19.30 28.09.2022 г.

# ПРАВИЛА РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «ПРИЗЫ В ПРИЛОЖЕНИИ КАТАЛОГ ONLINER»

Настоящие правила проведения рекламной игры (далее – Правила) разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями), определяют порядок проведения рекламной игры «Призы в приложении Каталог Onliner» (далее – Рекламная игра).

**1. Организатор Рекламной игры**

1.1. Организатором Рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «Онлайнер», юридический адрес: 220123, г. Минск, ул. Старовиленская, 100/7, 2-й этаж, зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190657494, свидетельство о государственной регистрации выдано Минским городским исполнительным комитетом 25.06.2014.

**2. Наименование Рекламной игры**

2.1. Настоящая Рекламная игра называется «Призы в приложении Каталог Onliner».

**3. Территория проведения Рекламной игры**

3.1. Рекламная игра проводится на территории Республики Беларусь.

**4. Срок начала и окончания Рекламной игры.**

4.1. Рекламная игра проводится с 03.10.2022 по 19.12.2022 (включая период проведения розыгрыша, вручения призов и публикации результатов проведения Рекламной игры).

**5. Цель проведения Рекламной игры**

5.1. Рекламная игра проводится в целях стимулирования потребления услуг электросвязи путем скачивания и установки на мобильные устройства приложения Каталог Onliner (далее – Приложение), а также увеличения количества пользователей Приложения и повышения их активности.

**6. Комиссия по проведению Рекламной игры**

6.1. Для проведения Рекламной игры Организатор создает комиссию по ее проведению (далее – Комиссия), осуществляющую контроль за соблюдением установленных Правил.

6.2. Состав Комиссии:

Председатель Комиссии:

- Кажуро Денис Петрович, ООО «Онлайнер», директор.

Члены Комиссии:

- Голуб Герман Юрьевич, ООО «Онлайнер», заместитель директора – начальник управления коммерции;
- Ляшкевич Никита Александрович, ООО «Онлайнер», заместитель директора – начальник отдела маркетинга;
- Назаренко Лилия Александровна, ООО «Онлайнер», маркетолог отдела маркетинга;
- Сахаров Сергей Леонидович, ООО «ГиперАйТиТрэйд», ведущий специалист по маркетингу.

**7. Участники Рекламной игры**

7.1. Участник – физическое лицо, установившее на мобильное устройство приложение Каталог Onliner, успешно прошедшее авторизацию в Приложении путем входа в уже существующую учетную запись (профиль) либо посредством регистрации новой учетной записи (профиля) и выразившее желание принять участие в Рекламной игре на условиях, предусмотренных в настоящих Правилах.

7.2. В Рекламной игре могут принимать участие совершеннолетние граждане Республики Беларусь, а также совершеннолетние иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство в Республике Беларусь и постоянно проживающие на территории Республики Беларусь.

7.3. Участниками Рекламной игры не могут быть лица, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, члены комиссии, супруг (супруга) таких лиц, их близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

**8. Порядок участия в Рекламной игре**

8.1. Для участия в Рекламной игре в период с 03.10.2022 по 13.11.2022 Участнику необходимо:

8.1.1. войти в приложение Каталог Onliner, а в случае его отсутствия – предварительно установить на мобильное устройство Приложение (версия не ниже 2.12.0 в Google Play и не ниже 2.6 в App Store);

8.1.2. совершить в приложении Каталог Onliner переход на страницу входа в уже существующую учетную запись (профиль) либо регистрации новой учетной записи (профиля), используя для этого баннер, расположенный на главной странице Приложения;

8.1.3. авторизоваться в Приложении путем входа в уже существующую учетную запись (профиль) либо посредством регистрации новой учетной записи (профиля) на заявленных Организатором условиях (https://blog.onliner.by/siterules);

8.1.4. в появившейся форме указать свои достоверные персональные данные – фамилию, инициалы либо имя и отчество (при наличии) полностью, а также ознакомиться с Правилами проведения Рекламной игры и подтвердить свое согласие на участие в игре посредством проставления «галочки» в соответствующем поле;

8.1.5. активировать кнопку «Участвовать».

Владелец учетной записи (профиля) может активировать кнопку «Участвовать» один раз в течение соответствующего периода активации, указанного в п. 10.1 настоящих Правил.

**9. Призовой фонд**

9.1. Призовой фонд Рекламной игры сформирован за счет имущества и денежных средств Организатора в размере **18821** (восемнадцать тысяч восемьсот двадцать один) белорусский рубль **16** (шестнадцать) копеек.

9.2. Призовой фонд Рекламной игры:

| | Наименование приза | Количество, шт. | Стоимость за ед., бел. руб. | Всего стоимость, бел. руб. | Ставка НДС, % | Сумма НДС, бел. руб. | Всего стоимость с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Приз | Мобильный телефон iPhone 13 128 | 6 | 2291,67 | 13750,00 | 20 % | 2750,00 | 16500,00 |
| | денежные средства в размере | | 386,86 | 2321,16 | – | – | 2321,16 |
| **Итого:** | | | | | | | **18821,16** |

**10. Порядок проведения розыгрыша призового фонда Рекламной игры**

10.1. Розыгрыш призов осуществляется в 6 (шесть) туров в приведенном в таблице порядке:

| Номер тура | Дата и время проведения розыгрыша | Период активации в Приложении кнопки «Участвовать» | Приз розыгрыша |
|---|---|---|---|
| Тур 1 | 14.10.2022, в 12:15 | с 03.10.2022 по 09.10.2022 (23:59:59) включительно | «Приз» всего 1 (один) приз |
| Тур 2 | 21.10.2022, в 12:15 | с 10.10.2022 по 16.10.2022 (23:59:59) включительно | «Приз» всего 1 (один) приз |
| Тур 3 | 28.10.2022, в 12:15 | с 17.10.2022 по 23.10.2022 (23:59:59) включительно | «Приз» всего 1 (один) приз |
| Тур 4 | 04.11.2022, в 12:15 | с 24.10.2022 по 30.10.2022 (23:59:59) включительно | «Приз» всего 1 (один) приз |
| Тур 5 | 11.11.2022, в 12:15 | с 31.10.2022 по 06.11.2022 (23:59:59) включительно | «Приз» всего 1 (один) приз |
| Тур 6 | 18.11.2022, в 12:15 | с 07.11.2022 по 13.11.2022 (23:59:59) включительно | «Приз» всего 1 (один) приз |

Розыгрыш призового фонда будет проводиться в присутствии Комиссии по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Старовиленская, 100/7, 2-й этаж, ООО «Онлайнер».

10.2. Розыгрыш проводится среди Участников, надлежаще выполнивших условия участия в Рекламной игре, в соответствии с требованиями настоящих Правил.

**11. Порядок проведения розыгрыша призового фонда и определения Победителей Рекламной игры**

11.1. К моменту начала проведения каждого розыгрыша призового фонда Организатор формирует список Участников (далее – Список), в котором каждому Участнику присваивается порядковый Игровой код в хронологическом порядке согласно дате и времени подтверждения Участником участия в Рекламной игре. В случае совпадения у Участников даты и времени активации кнопки «Участвовать» Игровые коды присваиваются по фамилии, имени, отчеству в алфавитном порядке. Нумерация Игровых кодов в Списке начинается с 1 (единицы).

11.2. Список включает в себя следующую информацию о допущенных к розыгрышу Участниках: Игровой код; номер учетной записи (профиля) – Onliner ID; дату и время активации кнопки «Участвовать»; фамилию, инициалы либо имя и отчество (при наличии) Участника полностью.

11.3. Для проведения розыгрышей используются лототрон, состоящий из одной секции, и набор шаров в количестве 10 штук с номерами от 0 до 9.

11.4. Определение выигрышных Игровых кодов получателей призов происходит путем их формирования слева направо из номеров шаров, поочередно извлекаемых из секции лототрона. Каждый розыгрыш начинается с определения первого разряда Игрового кода победителя слева.

11.5. Первый разряд Игрового кода победителя определяется следующим образом: в секцию лототрона загружаются шары с номерами от 0 до цифры, соответствующей первому разряду зарегистрированного Игрового кода. Шары перемешиваются, и из секции лототрона извлекается шар, номер которого определяет цифру первого разряда выигрышного Игрового кода. Номер шара вносится в протокол.

Далее в сектор лототрона загружаются те номера шаров, которые существуют по сверенному списку Игровых кодов в соответствующем разряде. Шары перемешиваются, и из секции лототрона извлекается шар, номер которого определяет цифру соответствующего разряда выигрышного Игрового кода. Номер шара вносится в протокол.

Для определения последующих разрядов выполняются те же действия. Номера шаров вносятся в протокол.

11.6. Выигравшим приз в розыгрыше считается Игровой код Участника, определенный согласно п.п. 11.3 – 11.5 настоящих Правил. В каждом туре разыгрывается 1 (один) приз.

11.7. Результаты каждого розыгрыша фиксируются в соответствующем протоколе, который подписывается всеми присутствующими членами Комиссии.

**12. Сроки и порядок уведомления Победителей о результатах розыгрыша призов Рекламной игры**

12.1. Организатор в течение 7 (семи) календарных дней с момента проведения розыгрыша уведомляет Победителя о выигрыше письмом, высланным на электронную почту, указанную Победителем при регистрации своей учетной записи (профиля) в приложении Каталог Onliner. Организатор также вправе дополнительно уведомить Победителя любым удобным ему способом: посредством SMS-рассылки на номер мобильного телефона, звонком по телефону и др.

**13. Порядок получения выигрышей**

13.1. Для получения приза Победители должны явиться не позднее 19.12.2022 (включительно) по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Старовиленская, 100/7, 2-й этаж, предварительно связавшись с Организатором по номеру многоканального телефона: + 375 (29) 514 35 24.

13.2. Получить приз можно с понедельника по пятницу с 10:00 до 17:00 (исключение составляют приходящиеся на официальные праздники дни), а также в субботу 17.12.2022 с 10:00 до 13:00. При получении приза Победитель предъявляет документ, удостоверяющий личность (паспорт – для граждан Республики Беларусь; вид на жительство в Республике Беларусь – для иностранных граждан и лиц без гражданства).

Победитель при получении приза письменно подтверждает факт его получения, заполняет все необходимые документы, предоставленные Организатором, связанные с получением приза.

13.3. В случаях невозможности связаться с Победителем для уведомления о выигрыше указанными в п. 12.1 способами; неявки Победителя за получением приза в определенный в п. 13.1 срок; указания недостоверных персональных данных в панели управления учетной записи пользователя на интернет-сайте Организатора; непредоставления Организатору сведений и документов, необходимых для получения приза; письменного отказа от получения приза либо отказа от подписи в документах, подтверждающих передачу приза, – Победитель лишается права на получение приза. В этих случаях приз остается в распоряжении Организатора и может быть использован им по собственному усмотрению.

13.4. В соответствии с главой 18 Налогового кодекса Республики Беларусь Организатор выступает налоговым агентом и при вручении Победителю выигрыша обязан удержать у последнего причитающиеся денежные средства в качестве уплаты подоходного налога с получателя приза.

13.5. Расходы, связанные с проездом Победителя к месту получения приза, Организатором не возмещаются.

13.6. Приз не подлежит замене. Выплата денежного эквивалента приза не осуществляется.

13.7. Приз не подлежит выдаче победителю иначе как в порядке, предусмотренном настоящими Правилами.

**14. Информация о Рекламной игре, публикация правил Рекламной игры**

14.1. Правила подлежат опубликованию до начала проведения Рекламной игры в газете «Звязда», приложении Каталог Onliner и на сайте Организатора – https://www.onliner.by.

14.2. Результаты Рекламной игры будут опубликованы в срок до 09.12.2022 (включительно) в газете «Звязда», приложении Каталог Onliner и на сайте Организатора – https://www.onliner.by.

14.3. Информацию о правилах и условиях участия в Рекламной игре можно получить в приложении Каталог Onliner и на сайте Организатора – Onliner.by (https://b2bblog.onliner.by), а также по номеру многоканального телефона + 375 (29) 514 35 24. Звонок платный в соответствии с тарифами операторов электросвязи, услугами которых пользуется Участник.

**15. Общие условия Рекламной игры**

15.1. Участие в Рекламной игре предполагает ознакомление и полное согласие Участника с настоящими Правилами, принятие на себя обязательств по соблюдению всех условий и требований. Несоблюдение Участником требований настоящих Правил признается как его отказ от участия в Рекламной игре.

15.2. Факт участия в Рекламной игре означает, что ее Участник соглашается с использованием его персональных данных в публикациях, связанных с опубликованием результатов Рекламной игры в газете «Звязда», приложении Каталог Onliner, а также на сайте Организатора – https://www.onliner.by.

15.3. Организатор вправе отстранить Участника от участия в Рекламной игре, отказать в выдаче приза при нарушении последним требований настоящих Правил.

15.4. Ответственность за достоверность сведений, персональных и иных данных возлагается на Участника.

15.5. Организатор не несет ответственности за работу сети Интернет при ее использовании Участником (например, за работу компаний, предоставляющих услуги по подключению к сети Интернет Участника), операторов сотовой подвижной электросвязи и организаций, оказывающих услуги интернет-эквайринга (плохое соединение с оператором, отсутствие интернет-эквайринга и т. д.) и почтовых сервисов (несвоевременная доставка электронных сообщений и т. д.).

15.6. При наличии споров между Организатором и Участником Рекламной игры они разрешаются в установленном законодательством Республики Беларусь порядке.

15.7. Претензии по вопросам проведения Рекламной игры принимаются Организатором по адресу: Республика Беларусь, 220123, г. Минск, ул. Старовиленская, 100/7, 2-й этаж, а также посредством электронной почты – game_app@onliner.by.

*Свидетельство № 4241 о государственной регистрации рекламной игры выдано 26 сентября 2022 г. Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.*

# ЦУДОЎНЫ САД...



Дрэвы абразалі так, як вучыў вопытны садавод.

## «Трэба дзейнічаць цяпер, інакш можа быць позна...»

Са старшынёй кааператыва «Цудоўны Сад» Наталляй ЮШКЕВІЧ я пазнаёмілася гэтым летам на семінары новых вяскоўцаў. Дзяўчына з такім захапленнем распавядала пра стары яблыневы сад, пра які яна клапоціцца разам з аднавяскоўцамі, што мне захацелася неяк іх падтрымаць. Яшчэ тады падумала, што абавязкова напішу пра цудоўную ініцыятыву ў газету. Тым больш Наталля прызналася, што будзе шчаслівая, калі іх досвед натхніць на добрую справу кагосьці яшчэ. «Я мару, каб захаваных садоў з глыбокай каранёвай сістэмай у нашай краіне было як мага больш. Бо гэта ўжо сфарміраваная экасістэма. Такія сады больш, чым новыя, маладыя, устойлівыя да змен клімату, засухі. Акрамя таго, старыя сады добра ўплываюць на водны мікраклімат вёскі. Многія кіраўнікі калгасаў, думаю, усё гэта разумеюць і самі хацелі б, каб такімі садамі хтосьці займаўся, але большасць вёсак, на жаль, апусцела, мала чалавек засталося, ды і тыя пераважна ў сталым узросце, ужо не будуць, як раней, — кожны сваю паласу абкошваць уручную ды абразаць, збіраць ураджай».

Гісторыя Наталлі наогул вельмі цікавая. Мінчанка, якая вывучае тэму арганічнага садаводства і агародніцтва, пераехала жыць у вёску шэсць гадоў таму. Перыядычна яна хадзіла гуляць у вясковы сад. Уяўляла, стоячы між яблынь, як цудоўна было б паспрабаваць узяць яго ў арэнду і зрабіць гэтае месца турыстычнай «разынкай». «Разам з тым, мяне спыняла думка, што я адна, а сад вялікі — не спраўлюся. Трэба спачатку падрасці фінансава, асвоіцца на вёсцы, набрацца вопыту, сабраць рэсурсы, каманду. Калі ж у адзін цудоўны дзень даведалася, што гэтае месца сілы плануюць выкарчаваць, то проста ўключыўся такі стан, як быццам хтосьці з родных сур'ёзна захварэў — калі не да сумненняў. Проста трэба дзейнічаць, прычым неадкладна. Інакш можа быць позна. Я напісала ў мясцовы чат, падзялілася з аднавяскоўцамі сваімі перажываннямі. Маўляў, вельмі хочацца захаваць сад і клапаціцца пра яго. Людзі адгукнуліся, аказалася, што сад патрэбны не толькі мне. Многія пісалі, што гэта вельмі важна, што гатовыя, чым змогуць, дапамагаць час ад часу. Сем чалавек, суседзяў па вёсцы, пагадзіліся ўступіць у кааператыў».

Яшчэ да таго, як вяскоўцам даверылі сад на год, яны з дазволу старшыні мясцовай гаспадаркі ў канцы зімы запрашалі эксперта — вопытнага лесніка і гаспадара свайго паспяховага саду. Ён вучыў мясцовых жыхароў і гасцей з горада правільна абразаць пладовыя дрэвы. «Дарэчы, Васіль Семчанка сказаў, што мы на правільным шляху, бо ў саду няма сур'ёзных хвароб, ад якіх сёння церпяць маладыя сады. Спецыяліст па стварэнні ўстойлівых прадукцыйных сістэм, з сур'ёзным вопытам назірання і карэкціроўкі вялікіх і малых гаспадарак, Вольга Шчыглінская, убачыўшы сад, таксама ўразілася, што ён, нягледзячы на ўзрост, у вельмі добрым стане. На яе думку, пры правільным доглядзе сад яшчэ 30 гадоў будзе даваць смачныя плады ў вялікай колькасці.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Менавіта таму сёння вельмі важна захаваць яго».

Пасля майстар-класа людзі, якія навучаліся, праявілі ініцыятыву: сабрацца ў іншы дзень, каб абрэзаць больш дрэў. «Мы зноў спыталі дазвол, ці можам тое зрабіць, і ў выніку першая лінія саду каля дарогі была збольшага прыведзена ў парадак. Затым мы пайшлі да старшыні мясцовай гаспадаркі і сказалі: «Нам хочацца працягваць даглядаць сад. Мы гатовыя і далей прыцягваць экспертаў, каб усё рабіць разумна». Старшыня сказаў, што не мае нічога супраць таго, каб перадаць нам сад. Заручыўшыся яго пісьмовай падтрымкай, звярнуліся ў Валожынскі райвыканкам з просьбай аб доўгатэрміновай арэндзе. У выніку гэтым летам нам даверылі догляд саду на год. Маўляў, паглядзім, як вы справіцеся з пакосам, зборам яблыкаў, пабелкай, абрэзкай. І гэта мудрае рашэнне, бо сапраўды важна, каб не толькі мясцовыя ўлады, але і мы самі пераканаліся, што цалкам разлічылі свае сілы і не закінем сад у будучыні недагледжаным. Вядома, няма сэнсу браць у арэнду гэты сад на 3, 5, 20 гадоў, бо ў нас доўгатэрміновы праект, мы хочам укладваць душой, рэсурсамі, часам свайго жыцця. Таму падавалі заяву на 99 гадоў».

Спачатку, праўда, на сваю пісьмовую заяву члены кааператыва «Цудоўны Сад» атрымалі адмову. Але пасля таго, як вяскоўцы прыйшлі на асабісты прыём да намесніка старшыні райвыканкама па сельскай гаспадарцы і расказалі пра свае планы, з'явілася надзея. «Праз нейкі час ён агучыў рашэнне, што мы можам узяць сад на выпрабавальны тэрмін. Калі ж пісалі заяву ў землеўпарадкавальнай службе на часовае карыстанне садам, нас супакоілі: калі добра пакажам сябе сёлета, то не павінна ўзнікнуць аніякіх праблем, і нашаму кааператыву перададуць сад у арэнду на 99 гадоў. Гэта не супярэчыць заканадаўству. Мы ўзрадаваліся і пачалі натхнёна прыводзіць сад у парадак».



Пленэр у садзе з удзелам мясцовай школы мастацтваў праводзіцца ўжо не першы год.

## «Прыязджаюць цэлымі сем'ямі»

Вяскоўцы ўжо правялі частковую абрэзку яблынь, пакасілі і згрэблі траву. «Мы з радасці купілі конную касілку, — распавядае Наталля. — Але на той момант, калі даведаліся, што нам даверылі сад, трава ўжо вырасла такой высокай, што яе можна было пакасіць толькі трактарам. Вясной жа плануем касіць ужо больш экалагічна, коннай касілкай. Прыствольныя кругі трактар, вядома, не змог пакасіць, таму мы вырашылі прыводзіць іх у парадак ручной касой. Я сама, у ліку іншых, раніцай у якасці зарадкі выходзіла і абкошвала дрэвы пакрысе. Спецыяльна з гэтай мэтай хадзіла да мясцовага жыхара, які навучыў мяне правільна ўпраўляцца з ручной касой. Разам з суседзямі зрабілі прыгожыя прыствольныя кругі са скошанай травы вакол часткі дрэў каля дарогі. Тутэйшая гаспадынька, якая трымае кароў і каня, дапамагала прыбіраць сена. Так, пакрысе, мы вучыліся працаваць разам і клапаціцца пра сад».

Цяпер жа ў «Цудоўнага Саду» самы адказны этап — збор яблыкаў. Ужо сабралі і здалі 30 тон. І гэта яшчэ далёка не фінішная прамая. Кожны, хто мае жаданне падзарабіць і тым самым падтрымаць цудоўны праект, яшчэ можа далучыцца. Уся інфармацыя — на старонцы ў «Інстаграм» пра сады Беларусі @planeta.sadov.

«Перад тым як пачаць збіраць яблыкі, мы даведаліся, дзе найлепшыя ўмовы іх прыёму. У выніку дамовіліся аб супрацоўніцтве з заводам, што знаходзіцца ў Маладзечне. Самі адвозім туды сабраныя яблыкі на грузавой машыне. Нам у той жа дзень аддаюць грошы і мы аператыўна разлічваемся са зборшчыкамі ды грузчыкамі». Толькі сіламі членаў кааператыва ўбраць сёлетні багаты ўраджай яблыкаў нерэальна, таму прыязджаюць дапамагаць сябры і сябры сяброў. «Мы кінулі кліч па сацсетках, ва ўсе сяброўскія чаты, — распавядае Наталля. — А яшчэ я праехалася з аўталаўкай па суседніх вёсках. Гутарыла з мясцовымі жыхарамі — удалося сагітаваць з дзясятак людзей, якія пагадзіліся прыйсці на збор. Таксама мы вывешвалі аб'явы ў Гародзьках, Валожыне. Па іх таксама тэлефанавалі людзі, якія хочуць падзарабіць. Прыязджаюць збіраць яблыкі нават цэлымі сем'ямі. І гэта радуе. Бо нам хочацца, каб сад служыў у першую чаргу людзям, тым больш ён заўсёды быў калектыўным. Карэнныя вяскоўцы дагэтуль з усмешкай згадваюць, як хадзілі разам туды працаваць».

## «З часам будуць ківі і бананы...»

Дарэчы, вяскоўцы хочуць не толькі клапаціцца пра яблыні, але і мараць ператварыць гэтую тэрыторыю ў сапраўдны вясковы батанічны сад.

«На месцы яблынь, што загінулі, мы будзем паступова дасаджваць арэхі, новыя яблынькі, ягады, кветкі і нават грыбы. Хочацца сабраць тут усе магчымыя віды пладовых дрэў, якія выспяваюць у нашым клімаце. У Інстытуце пладаводства я даведалася, што ёсць адмысловыя паўночныя сарты, з марозаўстойлівасцю да мінус 30 градусаў. Аналаг банана, фініка, ківі. Высаджваць новыя расліны будзем паступова. Хочам развіваць гэты сад як экасістэму, пільна сачыць за яе здароўем, рабіць толькі тое, што дакладна не нашкодзіць».

**«Калі ж у адзін цудоўны дзень даведалася, што гэтае месца сілы плануюць выкарчаваць, то проста ўключыўся такі стан, як быццам хтосьці з родных сур'ёзна захварэў».**

Члены кааператыва хочуць, каб вясковы сад стаў прыцягальным не толькі для мясцовых жыхароў, але і для экасвядомых турыстаў. Таму мараць на яго базе стварыць культурны і адукацыйны цэнтр — месца, куды можна запрашаць экспертаў і вучыць дзяцей і дарослых чамусьці новаму, ладзіць акустычныя прыродныя канцэрты без гучнай апаратуры і майстар-класы. У прыватнасці, налета плануюць зладзіць тут фестываль ручнога кашэння травы, семінар па пермакультурным агародніцтве, турзлёт, дзіцячы летнік. Тым больш досвед правядзення творчых мерапрыемстваў у вясковым садзе ўжо ёсць. Некалькі гадоў запар падчас цвіцення яблынь тут ладзіцца пленэр па жывапісе сумесна з Гародзькаўскай школай мастацтваў. «Прыязджае настаўніца са сваімі вучнямі, да іх далучаюцца мясцовыя дзеці і іх бацькі — і ўсе разам малююць у садзе. Усё гэта суправаджаецца прыемнай музыкай, чытаннем вершаў уголас. Словамі не перадаць, як гэта прыгожа — як у раі!»

Спачатку мерапрыемствы будуць праходзіць пад адкрытым небам. З часам у садзе з'явяцца навесы і лёгкія экалагічныя домікі з прэсаванай саломы на драўляных палях, без фундамента. У іх (альбо ў палатках) турысты пры жаданні змогуць пераначаваць. Падчас мерапрыемстваў, магчыма, будуць прадаваць стравы з прадуктаў, вырашчаных у садзе.

## «Пашчасціла купіць тут хату»

Яшчэ да таго, як пераехаць жыць у вёску, Наталля нейкі час валанцёрыла ў садзе, які выкупіла на Валожыншчыне сям'я фермераў, там жа паспрабавала разбіць свой першы пермакультурны агародзік. Шэсць гадоў таму сябры запрасілі дзяўчыну на канцэрт у Малое Запруддзе. «Ехала сюды часткова маршруткай, часткова аўтаспынам. Чалавек, які падвозіў, чамусьці высадзіў мяне менавіта каля вясковага саду. Лічу, што гэта было зусім не выпадкова, як быццам хтосьці хацеў сказаць: «Глядзі, і тут таксама ёсць сад...»

Цяпер дзяўчына, што вельмі сімвалічна, жыве ў хаце, якая знаходзіцца літаральна за дзвесце метраў ад таго саду. «Я трымала ў галаве думку, што, каб займацца садам, у ідэале трэба жыць побач з ім. І мінулагодняй вясной, абыходзячы з суседзямі сад, заўважылі каля закінутага дома машыну. «Ой, — кажа суседка па вёсцы, — я ўжо даўно хацела даведацца, можа, дом прадаецца. Але ніяк не магла вылавіць гаспадароў. А цяпер, падобна, яны прыехалі. Давайце зойдзем». Мы зайшлі і спыталіся: «Вы выпадкова не прадаяце хату?» — «Прадаём». Было відаць па тварах, што яны так узрадаваліся, што нехта хоча купіць іх хату.

Сёння Наталля разам з суседзямі і іншымі неабыякавымі да лёсу саду людзьмі працягвае збіраць яблыкі. Паралельна дзяўчына складае карту, на якой пазначае, дзе якія сарты растуць. Больш за ўсё ў садзе антонаўкі. «Мы скінуліся кааператывам і купілі прэс для выціскання соку. І ўжо адкрываем незвычайныя ўласцівасці гэтага познега сорту — праз дзень стаяння парэзанымі ў цяпле яблыкі даюць сок не кіслы, а салодкі! Антонаўка — суперпрадукт, з яе таксама плануем навучыцца рабіць воцат, мачыць, захоўваць на зіму». Хапае ў садзе і іншых сартоў, у тым ліку і рэдкіх. Вызначыць іх вяскоўцам дапамагаюць спецыялісты Інстытута пладаводства.

«Я адчуваю, што ўсё павінна атрымацца, — кажа Наталля. — Гэты сад патрэбны не толькі нашай і суседнім вёскам, але і свету як прыклад месца, дзе людзі імкнуцца жыць у згодзе з прыродай. У мяне ёсць мара — на базе саду стварыць музей усяго натуральнага, каб тут былі прадстаўлены розныя рамёствы — ганчарства, сталярства, ткацтва... У рэчаў з гліны, дрэва больш энергіі, жыцця. У маім уяўленні і музей, які, спадзяюся, з'явіцца ў садзе, будзе максімальна жывым і натуральным, дзе ўсё можна паспрабаваць зрабіць самім. Магчыма, хтосьці тут, як і я калісьці пасля наведвання Музея народнай архітэктуры і побыту ў Азярцы, натхніцца вясковым жыццём і захоча развівацца на вёсцы».

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК,**
*Валожынскі раён.*

**Фота з асабістага архіва герояў.**

# ЖАЛОБНАЯ «АРЫЯ» КАЛАС



## Што адбываецца ў Эстоніі?



**Бохан хлеба, упакоўка яек, малочныя і іншыя жыццёва неабходныя для кожнага прадукты — за некалькі месяцаў у эстонскіх крамах усё гэта падаражэла на 50 працэнтаў і нават больш, адзначыла gazeta.ee. Калі сюды дадаць яшчэ «інфарктныя» рахункі за электраэнергію, то ствараецца амаль поўнае ўяўленне аб сітуацыі ў гэтай прыбалтыйскай краіне. Магутныя ўдары па кішэні жыхароў звязаны з проста жахлівым ростам кошту энерганосьбітаў, падкрэсліла gazeta.ee. Краіна ўжо некалькі месяцаў запар утрымлівае сумнае лідарства ў Еўрасаюзе па ўзроўні інфляцыі. Па выніках мінулага месяца адпаведны паказчык перавысіў 25 працэнтаў. Аб гэтым паведаміла эстонская тэлерадыёкампанія ERR са спасылкай на даныя Еўрастата. Як адзначаюць эксперты, зараз рост цэн у 2,5 раза перавышае рост заробкаў, не кажучы ўжо пра пенсіі. Што ж адбываецца ў Эстоніі, чаго чакаць надалей?**

### Без святла і каналізацыі

Жыхары Эстоніі пасля нядаўняй гучнай заявы прэм'ер-міністра Кай Калас аб магчымых праблемах з электрычнасцю пачалі актыўна скупляць электрагенератары. Аб гэтым паведаміў партал дзяржаўнага тэлерадыёвяшчання ERR. Калас заклікала рыхтавацца да магчымых праблем з электразабеспячэннем у выпадку адключэння Расіяй Эстоніі, Латвіі і Літвы ад сваёй энергасістэмы. Хелір-Валдар Сеэдэр, старшыня партыі Isamaa, што ўваходзіць у кіруючую кааліцыю, адзначыў, што зварот прэм'ер-міністра да жыхароў Эстоніі наўрад ці дапамог іх супакоіць. «Такія крайнія заявы ствараюць няўпэўненае пачуццё і пакідаюць шызафрэнічнае ўражанне», — падкрэсліў палітык.

Эстонцы аказаліся на дзіва разваротлівымі — ужо на наступны дзень пасля жалобнай «арыі» Калас у крамах буйной гандлёвай сеткі Bauhof на паліцах засталіся апошнія электрагенератары. «Прэм'ер-міністр — выдатны прадавец. За дзень мы прадалі больш за 100 электрагенератараў. Гэта больш, чым за апошнія чатыры месяцы. Гэта сведчыць аб тым, што людзі вельмі хутка зрэагавалі на атрыманую ад прэм'ера інфармацыю», — сказаў ERR менеджар сеткі Свен Мілі.

Паводле звестак партала, жыхары Эстоніі сталі больш актыўна купляць сухія прадукты харчавання, кармы для жывёл, прадметы асабістай гігіены, ліхтарыкі і батарэйкі. «Мы назіраем рост продажаў у пэўных таварных групах. На 10 працэнтаў павялічыліся продажы сухой ежы, корму для жывёл, туалетнай паперы і прадметаў гігіены», — адзначыў выканаўчы дырэктар гандлёвай сеткі Rimi Вайда Падумяэ.

У сваю чаргу работнікі Выратавальнага дэпартамента нагадалі эстонцам аб важнасці падрыхтоўкі да крызісных сітуацый. На чорны дзень у запасе павінны быць батарэйкі, ліхтарыкі, знешнія акумулятары, радыё, сухая ежа, лекі, а самае галоўнае — пітная вада, па тры літры ў дзень на кожнага члена сям'і. Трэба быць гатовымі і да адключэння каналізацыі. «Калі ўзнікне патрэба, то ёсць рашэнне. Бярыце загадзя набыты вялікі смеццевы мяшок, замацоўваеце яго на ўнітаз пад стульчак. Калі дома ёсць кот, то можаце ў пакет насыпаць напаўняльнік для кацінага туалета. Пасля гэтага вы робіце ў пакет свае справы і заклейваеце яго ізастужкай», — параіў эстонцам эксперт Выратавальнага дэпартамента Міка Віркала.

### Прынцэса вайны з абагравальнікам

Старшыня эстонскай Кансерватыўнай народнай партыі (EKRE) Марцін Хельмэ абвінаваціў цяперашняга прэм'ер-міністра ў тым, што яна да крайнасці абвастрыла адносіны дзяржавы з суседняй Расіяй, паставіўшы тым самым




Эстонію пад пагрозу, заўважыла err.ee. «Завяршаецца шоу, якое нам Кая Калас і Партыя рэформ дэманстравалі пачынаючы з лютага. Што ў нас ёсць? «Прынцэса вайны», якая ездзіць атрымліваць ад нейкіх заходніх фірмаў медалі і граматы за тое, што цяўкае ў бок Расіі і з бадуна прыбірае танкавыя манументы. У выніку гэтага мы аказаліся ў вачах Крамля адной з самых варожых дзяржаў на межах Расіі. І тут надыходзіць рэальнасць. Аказваецца, мы ўвогуле да гэтага не падрыхтаваліся, — заявіў Хельмэ. — Тое, куды завяла нас Кая Калас са сваімі трызненнямі і імкненнем любой цаной павялічыць працэнт падтрымкі сваёй партыі, настолькі засмучае, што, калі асэнсаваць гэта рацыянальна, людзі звар'яцеюць».

Днямі прэм'ер-міністра Эстоніі выкрылі ў выкарыстанні абагравальніка на працоўным месцы. Фота апублікавала выданне Uued Uudised. На яго звярнулі пільную ўвагу карыстальнікі сацыяльных сетак. Яны з сарказмам паставіліся да абстаноўкі кабінета Калас, якая раней заклікала эстонцаў максімальна эканоміць электраэнергію ў сувязі з агульнаеўрапейскім крызісам і адмаўляцца ад энергаёмістых электрапрыбораў. «Яна дзяўчынка, ёй можна», «У бункеры ў Гітлера вельмі горача топяць», «Што дазволена Юпітэру, не дазволена быку», «Чаму не Javelin (амерыканская супрацьтанкавая ракетная ўстаноўка, з якой любіць пакрасавацца эстонскі прэм'ер — рэд.)? Ён яе сапраўды сагрэе!», «А гэта ж яшчэ зіма не пачыналася...» — пракаментавалі навіну карыстальнікі сацсетак.

Па словах старшыні Кансерватыўнай народнай партыі, цяперашні энергетычны крызіс не з'яўляецца чымсьці непазбежным і няўхільным, і большасць спажыўцоў у Эстоніі можна забяспечыць электраэнергіяй па 30 еўра за мегават-гадзіну, атрымліваючы прыбытак. Аб гэтым Марцін Хельмэ заявіў на тэлеканале ETV. «Я хачу яшчэ раз падкрэсліць, што энергетычны крызіс, з якім мы сутыкнуліся, не з'яўляецца нечым непазбежным. Гэта не нешта нечаканае, што [раптам] адбылося, гэта не нешта непрадбачанае, з чым мы нічога не можам зрабіць. Гэта відавочны вынік палітычных выбараў і рэгулятыўных рашэнняў. Тое, што ў нас цяпер адбываецца, — вялікае пераразмеркаванне багацця. Ва ўсіх людзей забіраюць вялікія грошы, і яны пераходзяць невялікай кучцы тых, хто круціцца ад задавальнення», — заўважыў Марцін Хельмэ. Па яго словах, у Эстоніі няма дэфіцыту ў вытворчасці энергіі, які мог бы прывесці да высокіх цэн.

### Хваля банкрутцтваў і пратэстаў

Па словах старшага эканаміста эстонскага банка Swedbank Лійс Эльмік, у найбліжэйшыя месяцы ў краіне працягнецца вельмі хуткі рост цэн, паведаміла err.ee. «Сярэдні спажывецкі кошык за год узрос на чвэрць. Эстонія знаходзіцца ў верхніх радках еўрапейскай табліцы па росце цэн. Нават ва Украіне цэны растуць павольней, чым у Эстоніі», — адзначыла Эльмік. Па словах старшага эканаміста Swedbank, на долю энерганосьбітаў прыйшлося больш за палову росту агульнага спажывецкага кошыка. «За год кошт электраэнергіі і газу павялічыўся больш чым у тры разы. Зніжэнне пакупніцкай здольнасці стрымлівае спажыванне. У летнія месяцы сем'ям дапамагалі зберажэнні, назапашаныя раней. У перыяд з чэрвеня да ліпеня зберажэнні хатніх гаспадарак скараціліся на 20 мільёнаў еўра», — адзначыла эксперт. Высокая інфляцыя становіцца прычынай адмовы эстонцам у атрыманні крэдытаў.

Раней стала вядома, што эстонскія кампаніі звярнуліся да ўлад з просьбай аб часовым прыпыненні антырасійскіх санкцый, паведаміла PIA «Навіны». Паводле слоў кіраўніка МЗС Эстоніі Урмаса Рэйнсалу, з ініцыятывай аб часовым прыпыненні санкцый ЕС супраць Расіі для прадаўжэння імпартавання адтуль нафтапрадукту выступілі 28 эстонскіх кампаній. Сярод іх — трэйдар Trafigura і эстонская дзяржаўная чыгуначная кампанія Operail.

Перспектывы несуцяшальныя. Эканоміка Эстоніі сёлета скароціцца на 0,5 працэнта пры інфляцыі каля 19 працэнтаў. Такія даныя прыводзяцца ў апублікаваным эканамічным прагнозе Банка Эстоніі на 2022—2024 гады, у якім адзначаецца, што хуткі рост цэн прывядзе эканоміку прыбалтыйскай краіны да рэцэсіі і скарачэння спажывання. «Інфляцыя — гэта як тэмпература ў хворага. Калі яна 2-3 працэнты, то ўсё нармальна, калі 28 працэнтаў — гэта ўжо хвароба», — адзначыла эканаміст Банка Эстоніі Наталля Вільман. Старшы эканаміст Swedbank Лійс Эльмік, кажучы аб будучай зіме, не мае асаблівых надзей на тое, што сітуацыя палепшыцца. «Зіма будзе дарагой», — такі яе кароткі вердыкт. Інфляцыя працягне раскручвацца і налета. Паводле эканамічных прагнозаў, рост цэн можа спыніцца хіба што толькі ў 2024 годзе.

Тым часам урад Эстоніі працягвае праводзіць палітыку, накіраваную на мілітарызацыю краіны, адзначыў Baltnews. Ні энергетычны крызіс, ні гіперінфляцыя не могуць пахіснуць пазіцыю ўладаў. Ваенныя выдаткі працягваюць нарошчвацца. Міністр абароны прыбалтыйскай рэспублікі Хана Пеўкур адзначыў, што ў 2023 годзе на ваенныя патрэбы будзе выдзелена 2,7 працэнта ВУП, гэта перавысіць 800 мільёнаў еўра. Як вядома, сёлета яны перасягнулі рэкордныя 2,3 працэнта ВУП, што ў грашовым выражэнні склала 748 мільёнаў еўра.

Ураду варта неадкладна прызнаць, што ў Эстоніі крызіс, заявіў галоўны рэдактар Laane-Virumaa Uudised Айвар Хундзімягі на Vikerraadio. Як лічыць эксперт, «хутка мы ўбачым рост запазычанасцяў, хвалю банкрутцтваў, пераразмеркаванне доляў рынку як у нас, так і за мяжой, а таксама зніжэнне тэмпу інвестыцый і павышэнне ўзроўню беспрацоўя».

Прынамсі хваля масавых пратэстаў нарастае ўжо цяпер. Апазіцыйная Цэнтрысцкая партыя правяла на плошчы перад будынкам парламента (Рыйгікогу) мітынг супраць павышэння цэн. Неабходнасць такой акцыі пратэсту арганізатары агучылі так: «У Эстоніі ўжо чатыры месяцы запар інфляцыя складае больш за 20 працэнтаў, але ўрад заняў пазіцыю назіральніка і не распачаў для вырашэння сітуацыі канкрэтных крокаў. Пад ударам даходы людзей, працоўныя месцы і пакупніцкая здольнасць. Апасенні гэтых цалкам зразумелыя». Афіцыйны Талін заняты палітычнымі гульнямі, якія да патрэб простых эстонцаў не маюць ніякага дачынення. А халады ўжо на парозе.

**Пётр ДУНЬКО.**

**Тым часам**

### «ПРАВАКАЦЫІ Ў ДАЧЫНЕННІ ДА СУВЕРЭНІТЭТУ І НЕЗАЛЕЖНАСЦІ»

**МЗС Беларусі адрэагаваў на зневажанне кіраўніцтвам Эстоніі норм паважлівых міждзяржаўных зносін**

У МЗС Беларусі 23 верасня была выклікана часовая павераная ў справах Эстоніі ў Рэспубліцы Беларусь Трыін Хіесалу. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе ведамства. «МЗС Беларусі прааналізавала шэраг нядаўніх наўмысных дзеянняў эстонскага кіраўніцтва, сярод якіх афіцыйныя спробы прысвоіць права выступаць ад імя беларускага народа і авантуры на пляцоўцы ААН. Яны не могуць быць расцэненыя інакш, як правакацыі ў дачыненні да суверэнітэту і незалежнасці нашай краіны. Павага гэтых прынцыпаў, роўна як і неўмяшальніцтва ва ўнутраныя справы адна адной, — базавая аснова нармальных двухбаковых адносін паміж любымі дзяржавамі. Таму іх відавочнае зневажанне з боку кіраўніцтва Эстонскай Рэспублікі ў дачыненні да Рэспублікі Беларусь не можа застацца без адпаведнай рэакцыі», — заявілі ў ведамстве.

Ва ўмовах непаважлівага стаўлення да суверэнітэту нашай краіны з боку эстонскага кіраўніцтва Рэспубліка Беларусь у адпаведнасці з Венскай канвенцыяй аб дыпламатычных зносінах не бачыць сэнсу шырокай дыпламатычнай прысутнасці Эстоніі на сваёй тэрыторыі. «У сувязі з гэтым штат пасольства гэтай краіны з 1 кастрычніка 2022 года павінен быць даведзены да аднаго дыпламатычнага супрацоўніка для выканання консульскіх функцый і аднаго работніка адміністрацыйна-тэхнічнага персаналу. Аналагічным чынам беларускі бок скароціць сваю дыпламатычную прысутнасць у Эстоніі. Пасол Рэспублікі Беларусь у Эстоніі адгукаецца на кансультацыі ў Мінск», — паведамілі ў МЗС.

